Манастыр у Залешанах ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Людміла Канэцкая ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2685) Год LII | Беласток, 28 кастрычніка 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Хто зараз кіруе музеем?

Аляксей МАРОЗ

На мінулым тыдні ў Гайнаўцы паявілася інфармацыя, што дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры Ян Карпюк падаў у адстаўку. Раней гарадскія радныя, а праз мясцовыя масмедыі і жыхары Гайнаўкі, даведаліся пра фінансавыя цяжкасці музея, які стаў тады самым вялікім даўжніком Прадпрыемства цеплавой энергетыкі. Калі ўжо даўно абагравaліся офісныя памяшканні ў Гайнаўцы, у музейным будынку было холадна. Бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк тлумачыў на гарадской сесіі, што на фінансавыя цяжкасці музея маюць уздзеянне таксама нявырашаныя справы ўласнасці музейных будынкаў. Размовы ў справе ўласнасці паміж прадстаўнікамі Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры" ў Гайнаўцы і Галоўнага праўлення БГКТ вядуцца ўжо доўгі час і асобы, што сочаць за імі, сталі ўжо сумнявацца ці ўдасца ў хуткім часе вырашыць іх палюбоўна. Разам з новымі весткамі наконт музея паявіліся пытанні без адказу. Паспрабаваў я высветліць іх у размовах з музейнымі ўладамі і людзьмі, звязанымі з дзейнасцю музея.

Спачатку рашыўся я пацвердзіць інфармацыю аб адстаўцы дырэктара і звярнуўся ў гэтай справе да Яна Карчэўскага — намесніка старшыні аб'яднання, якое кіруе музеем. Сказаў ён, што чуў аб адстаўцы дырэктара Карпюка, але ніхто афіцыйна не інфармаваў яго аб такім вырашэнні і адаслаў мяне да старшыні аб'яднання Міраслава Морданя, які з'яўляецца непасрэдным начальнікам дырэктара музея. Да яго павінен быў звярнуцца Ян Карпюк, калі схацеў бы падаць у адстаўку.

— На апошнім пасяджэнні ўправы нашага аб'яднання летам была зацверджана фінансавая дзейнасць музея і не было тады вялікіх даўгоў. Мусілі яны паявіцца ў апошнім часе, а вялікае значэнне для дзейнасці музея мае нявырашаная справа ўласнасці музейных будынкаў, — заявіў намеснік старшыні аб'яднання Ян Карчэўскі.

Чарговы мой суразмоўца, былы настаўнік Гайнаўскага белліцэя Аляксей Харкевіч, які часта наведвае музей і многа працуе ў ім на грамадскіх пачатках, пацвердзіў, што дырэктар Ян Карпюк падаў у адстаўку.

— У адстаўку дырэктар падаў у панядзелак (размаўляў я пасля панядзелка — 15 кастрычніка — А. М.). У размове са мной гаварыў ён, што трэба было даслаць у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі праекты на дафінансаванне дзейнасці музея, а нявырашаная справа ўласнасці музейных будынкаў не дазволіла выступаць за грошы для музея. Звяртаў ён увагу, што цяжка працаваць ва ўмовах, калі юрыдычным уласнікам будынкаў з'яўляецца БГКТ. Дырэктар працаваў таксама за невялікія грошы, — тлумачыць Аляксей Харкевіч. — Аднак чуў я, што ў хуткім часе кіраўніцтва БГКТ мае разважаць ці не перадаць музейныя будынкі на ўласнасць гайнаўскаму аб'яднанню.

Фота Аляксея Мароза

Музейныя будынкі ўжо доўгі час чакаюць вырашэння справы іх уласнасці

У музеі працаўнікі паінфармавалі мяне, што дырэктар якраз у водпуску.

— Ужо некалькі дзён абагравaецца наш музей, — сказалі радасна працаўнікі, якія заявілі таксама, што іх ніхто не інфармуе ці сапраўды дырэктар падаў у адстаўку.

— Мы непасрэдна не адчуваем фінансавых цяжкасцей, — дабавіла Іаланта Вішнеўская і разам з сяброўкай паінфармавалі, што зарплату атрымліваюць яны тэрмінова.

Прыйшлося мне таксама паразмаўляць са шматгадовым членам музейнага аб'яднання Віктарам Бурам, які ў мінулым быў старшынёй рэвізійнай камісіі музея і зараз таксама наведвае музейны будынак.

— Я быў на рынку і зайшоў у музей, каб спраўдзіць ці дайшлі складчыны, што я ўплаціў за сябе, жонку і дачку. Калі сустрэў я дырэктара Яна Карпюка, паінфармаваў ён мяне, што спяшаецца, бо ёсць у водпуску і заявіў: „Я падаў у адстаўку і адыходжу з пасады дырэктара". Аднак ён не тлумачыў мне прычын свайго рашэння, — паінфармаваў Віктар Бура.

Патэлефанаваў я дырэктару Яну Карпюку, каб дамовіцца на размову. Аднак дырэктар не схацеў гаварыць пра сваю адстаўку і хутка адклаў трубку. Не змог я спалучыцца па тэлефоне другі раз, каб пагаварыць пра іншыя музейныя справы. Намнога больш гаваркім быў старшыня Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры" Міраслаў Мордань, але яго выказванне на тэму адстаўкі дырэктара музея моцна мяне здзівіла.

— Я нічога не ведаю ў справе адстаўкі дырэктара Яна Карпюка, — заявіў Міраслаў Мордань. — Я некалькі дзён таму размаўляў з дырэктарам Карпюком і ён не выступаў да мяне з просьбай аб звальненні. Можа дырэктар разважаў ці падаць у адстаўку, але каб гэта зрабіць, павінен быў выступіць да мяне з пісьмовай просьбай, а гэтага не было. Можа ён атрымаў прапанову лепшай працы ў іншым месцы, але я аб гэтым таксама нічога не ведаю.

— А можа ў музеі была нейкая сварка? — стараюся высветліць прычыну закалоту.

— Не было ніякай сваркі і мы супольна многа робім, — тлумачыў Міраслаў Мордань, які адначасна звярнуў увагу на цяжкасці. — Праца дырэктара музея — занятак нялёгкі, а ў музеі ёсць фінансавыя складанасці. Узніклі яны між іншым з-за таго, што прадпрыемствы, якія наймаюць памяшканні, не плацілі тэрмінова арэнды.

Старшыня Міраслаў Мордань, так як іншыя мае суразмоўцы лічыць, што фінансавыя ўмовы дзейнасці музея намнога палепшыліся б, калі б аб'яднанне пераняло на ўласнасць музейныя будынкі.

— Было некалькі пасяджэнняў у Акруговым судзе ў Беластоку ў справе вырашэння ўласнасці музейных будынкаў. Справа была спынена і доўгі час вяліся размовы наконт палюбоўнага вырашэння недаразуменняў. Зараз

працяг ☞ 5

Праграма XIV Фестывалю „Бардаўская восень 2007"

1. Пятніца 26-10-2007
Бельск-Падляшскі, Бельскі дом культуры, 18:00

— Адкрыццё фестывалю, конкурс, перапынак, Сёстры Жменька, Ілона Карпюк з гуртом, Лявон Вольскі

2. Субота 27-10-2007
Бельск-Падляшскі, Бельскі дом культуры, 18:00

— Вынікі конкурсу, Алесь Камоцкі, Андрэй Мельнікаў, Віктар Шалкевіч, перапынак, Кася Камоцкая, ВЗ-Аркестр

3. Нядзеля 28-10-2007
Гайнаўка, Музей і асяродак беларускай культуры, 19:00

— Андрэй Мельнікаў, Алесь Камоцкі,

Беласток, канцэрт у прамым эфіры на Студыі Рэмбрандт Радыё Беласток, пачатак а гадз. 16:00

Ліпскі каравай цыцаты ☞ 5

Міра ЛУКША

Каляндар-даведнік ☞ 9

Сяргей ЧЫГРЫН

Запалкі

Дзверы камеры цэнтра ізаляцыі правапарушальнікаў павольна адчыніліся.

— Добры вечар, — вітаецца вялікі міліцэйскі начальнік у цывільным. — Я сёння дзяжурны. Ці ёсць якія нараканні на персанал?

— Не, — адказваюць „правапарушальнікі". — А вось на міліцыю, на спецслужбы, на рэжым — ёсць, бо хапілі без „Добры дзень", заламалі рукі і кінулі ў смярдзючую камеру. Ды яшчэ сведчылі на судзе фальшыва, што мы брудна лаяліся.

— Гэта не да мяне, — адказвае начальнік. — Ва ўсім разбіраецца суд.

Ужо да суда прыйшлося пераначаваць ноч за кратамі, таму і сумневаў не было пра тое які будзе вырак. Суддзя заслухаў сведкаў (якія па сумяшчальніцтве падпрацоўвалі работнікамі органаў), і прыняў рашэнне, што ім можна верыць.

— Чым тады растлумачыць, — пытаюся ў суддзі, — што напярэдні кожнай вулічнай акцыі апазіцыянеры пагалоўна пачынаюць брудна лаяцца, ды яшчэ так, што акрамя міліцыі іх ніхто не чуе? І чаму акрамя запальнічак яны носяць з сабой яшчэ і запалкі?

— Гэта справы не тычыцца, — адказвае суддзя і абвяшчае сваё рашэнне: каму пяць сутак арышту, каму сем, каму дзесяць...

Новы ізалятар, які пабудавалі ў Кастрычніцкім РАУСе, гонар горада Гродна і МУС. Кажуць, туды нават замежнікаў прыводзяць, каб паказаць, якія цудоўныя ўмовы зробленыя для перавыхавання хуліганаў. У кожнай камеры нават унітаз ёсць. Праўда, чамусьці без крышкі. І халодная вада ў наяўнасці. Тыя, каму даводзіцца адбываць пакаранне ў Ленінскім раёне старадаўняга Гродна, не маюць і гэтага. А ў астатнім усё як і ўсюды. Дошкі, на якіх спіш, краты, на якія ўглядаешся ты і жалезныя дзверы з вочкам, праз якое ўглядаюцца на цябе. Персанал не мае да цябе анічога асабістага. Міліцыянты спакойна выконваюць сваю працу.

Найбольш прыгнятае тое, што ты цалкам адарваны ад інфармацыі. Што там на свабодзе — застаецца загадкай. Гэта тычыцца перш за ўсё сям'і. Астатняе можна прагназаваць. І тое, што на Еўрапейскі марш збярэцца не больш за дзесяць тысяч чалавек, бо актывісты туды не даедуць і хутка заселяць суседнія камеры. І што Нобелеўскую прэмію дадуць не прэтэндэнту з Беларусі таксама можна прадбачыць. І нават тое, што беларуская зборная па футболе прайграе Люксембургу, бо ёй кіруе былы супрацоўнік ГДРаўскіх спецслужбаў. Па-нашаму КДБэшнік. Ну а дзе яны верхаводзяць, там толку няма. Усё развальваецца. Справа толькі часу. Той нядаўна трэніраваў зборную Ірака пры Садаме Хусейне. Ужо і Садама няма, а ён усё пры ранейшай пасадзе. Толькі краіну памяняў.

Тое, што ў камеры холадна спаць, не так страшна. Больш важна з кім ты сядзіш. Калі туды які прадпрымальнік патрапіць за несвоечасовую выплату штрафу, то лічы што пашанцавала. Пасля адсідкі твая арганізацыя папаўняецца новым сябрам. Ну а калі з табой які сямейны скандаліст у нецвярозым стане, то пакуль яму растлумачыш што да чаго, то сапраўды можаш навучыцца размаўляць мацюкамі. Хоць у канцы размовы і той пачынае нешта разумець і прапаноўваць свае паслугі. Лепш, кажа, я на мітынг схаджу, чым мая жонка зноў мяне здасць у міліцыю. А вось калі сядзіш з такімі ж як ты апазіцыянерамі, час праходзіць пад дыскусіі якая партыя лепшая. У канцы кожны застаецца пры сваёй думцы. Але хоць твая арганізацыя пры гэтым раскладзе не мае шанцаў папоўніцца, такі варыянт больш прыемны. І час хутчэй ляціць.

— Хачу курыць! Дайце запалкі, — чуецца з нейкай камеры. Справа ў тым, што цыгарэты мець арыштаваным дазваляюць, а вось запальнічкі забіраюць.

— А ў вас ёсць запалкі? — пытаецца ў нас вялікі міліцэйскі начальнік у цывільным.

— Зразумела што ёсць, — адказваюць „парушальнікі". — Мы як выходзім на акцыі, то заўсёды бярэм іх з сабой, бо ведаем, што будзем лаяцца мацюкамі.

Начальнік крыва ўсміхаецца і, пажадаўшы добрай ночы, выходзіць з камеры, пакідаючы апазіцыянераў у разважаннях ці хутка яны сюды патрапяць зноў пасля выхаду на волю. Бо калі акцыя ў Мінску зацягнулася, то не паспееш пераступіць парог міліцэйскага будынка як цябе яшчэ раз затрымаюць і вернуць назад. Што называецца — за рыла і ў стойла. Так што пры выхадзе на свабоду ўсё можна пакінуць у камеры іншым, але запалкі трэба браць з сабой. Могуць зноў спатрэбіцца.

Віктар САЗОНАЎ

Абыякавыя войты

У „Ніве" № 41 ад 14 кастрычніка 2007 г. Аляксей Мароз у артыкуле „Хто пасля Гайнаўкі" закрануў справу ажыццяўлення закону аб нацыянальных меншасцях і рэгіянальнай мове. Сейм даў нацыянальным меншасцям, у тым ліку і нам, беларусам, магчымасць публічна карыстацца сваёй мовай і ставіць двухмоўныя дарожныя ўказальнікі. Рада горада Гайнаўкі пакарысталася законнымі магчымасцямі і прыняла адпаведную пастанову аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай. І вельмі добра, што ў нас ёсць такія радныя, якія даражаць мовай сваіх дзядоў і бацькоў, стараюцца надаць ёй адпаведны ранг. Аднак праведзенае ніўскім журналістам апытанне паказвае, што ў гмінах Гайнаўшчыны войты, чыноўнікі і радныя ставяцца да гэтай справы абыякава або насцярожана.

Я сам размаўляў з многімі раднымі, настаўнікамі, салтысамі, адукаванымі маладымі людзьмі. Усе яны падкрэслівалі, што закон ад 6 студзеня 2005 г. даўно павінен быць уведзены войтамі ў гмінах. Чаму ж тады нашыя беларускія, абраныя народам войты ўжо трэці год бяздзейнічаюць, маўчаць, быццам вады ў рот набраўшы. Нехта скажа, што гэта справа рады, а не войта. Аднак публічнай таямніцай з'яўляецца факт, што войты маюць вялікі ўплыў на раду, на яе старшыню і радных. Відаць, загадалі яны закон схаваць глыбока ў шуфляду і на сесію з гэтай справай не выходзіць. Вядома, кожны старшыня рады за сваё пакорлівае старшынаванне атрымоўвае грошы, і то немалыя. І таму служаць яны „самаўрадаваму пану", а не сваім падаткаплацельшчыкам.

Вельмі засмуціла мяне выказванне войта Арлянскай гміны ў кастрычніцкім штомесячніку „Czasopis", які ўвядзенне беларускай мовы ў якасці дапаможнай палічыў непатрэбным, бо... „наша мова ўвесь час жыве, людзі і так ёю карыстаюцца". Аднак войт дапускае магчымасць увядзення двухмоўя, калі штораз менш людзей будзе карыстацца беларускай мовай. Тады, паабяцаў ён, трэба будзе ажыццявіць ідэю двухмоўя. Ягоная гмінная ўстанова не падпісваецца таксама на беларускія выданні.

Шаноўныя войты і чыноўнікі, вам трэба памятаць, што вы выйшлі з беларускіх вёсак. Не чакайце чарговых выбараў, не аглядайцеся ні направа, ні налева, толькі ажыццяўляйце закон. Вы ж з беларускай калыскі і ласкі не робіце, бо права беларусамі звацца і карыстацца беларускай мовай дала нам Рэч Паспалітая, вольная Польшча. Ваш абавязак — не бунтаваць радных, толькі гуртаваць іх вакол справы ўвядзення дапаможнай беларускай мовы і двухмоўных указальнікаў. Пакіньце наступным пакаленням добрую памяць па сабе, бо як добра ведаеце, пасада чыноўніка не пажыццёвая... Прыпомніце сабе радкі з паэмы Якуба Коласа „Новая зямля": „Мой родны кут, як ты мне мілы!../ Забыць цябе не маю сілы" і можа яны ўзрушаць ваша сумленне.

Спадар войт, не саромцеся свайго!!!

Віктар БУРА

Вачыма еўрапейца

Давыбарчы пейзаж

Калі аддаем у друк гэты нумар „Нівы", яшчэ невядомыя канчатковыя вынікі парламенцкіх выбараў. Тым не менш усе знакі на небе і зямлі паказваюць, што з ліку пяцёркі стартуючых у Сейм кандыдатаў, якія адкрыта ідэнтыфікуюцца з беларускім асяроддзем (Яраслаў Матвяюк, Яўген Чыквін — ЛіД; Мікалай Яноўскі, Антон Мірановіч — ПСЛ; Марк Масальскі — ГП), шанцы на ўваход маюць Яраслаў Матвяюк і Яўген Чыквін. М.інш. такую інфармацыю можна было вычытаць некалькі дзён да выбараў на інтэрнэтных старонках маладога льва падляшскага ПіС Рафала Рудніцкага (беластоцкага раднага). Абапіраўся ён на апытальнік, праведзены Польскай дасследчыцкай групай грамадскай думкі (ПДГГД). Аднак пададзеныя ім прозвішчы магчымых парламентарыяў з'яўляюцца выключна калькуляцыяй Рафала Рудніцкага. Згодна з прадказаннямі ПДГГД з Падляшша ў Сейме засядаць будуць 7 дэпутатаў ад ПіС, 5 ад ГП, 2 ад ЛіД і 1 ад ПСЛ. Сам факт прароцтва раднага Рудніцкага мяне не здзіўляе і я нават у змозе з ім пагадзіцца. Рашуча больш бянтэжылі мяне ягоныя заявы ў далейшай частцы інтэрнэтнага тэксту тыпу: „Прыкра, што на партыйных сходах з пенай на вуснах крычыць пан Владыслаў Барташэўскі, а пан Тадэвуш Мазавецкі апасаецца манаполіі ці нават дыктатуры адной партыі (вядома, ПіС)". Насмяяўся кацёл з гаршка, але сам чорны. Парагатаў лысы з пляшываго.

Вядома, цяжка здзіўляцца Рафалу Рудніцкаму, ён жа ж урэшце з'яўляецца адным з дзеячаў падляшскага ПіС з г.зв. першага рада і адчуваў — мабыць — патрэбу ўключыцца ў выбарчую кампанію, у абарону свае партыі. Ангажаваліся ў гэтую кампанію таксама СМІ.

Найгорш, па-мойму, што ў кампанію ГП ангажаваўся асабіста прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі, а ягоны намеснік Тадэвуш Арлуковіч нават балатаваўся са спіска ГП. Прэзідэнт Трускаляскі паяўляўся на давыбарчых прэс-канферэнцыях Платформы і з кожным днём станавіўся ўсё больш актыўным. Неяк выпадкова пару гадзін да выбарчай цішыні адкрыў ён гарадскі пляц пад беластоцкай ратушай. Раней м.інш. адкрываў школьныя спортпляцоўкі, падпісваў інтэнцыйны ліст у справе арганізацыі ў Беластоку аднаго з этапаў велагонкі Tour de Pologne, прэзентаваў праект парку на пасёлку ТБС і г.д, і да г.п. Два апошнія дні да выбарчай цішыні каляндар ягоных публічных выступленняў і сустрэч быў запоўнены з берагамі.

— Ці гэта ў парадку, што прэзідэнт пасрэдна ангажуецца ў выбарчую кампанію, а віцэ-прэзідэнт нават стартуе ў выбарах і абодва далей выконваюць свае функцыі, а Гарадская ўправа з'яўляецца арганізатарам выбараў? — спытаўся я ў гасцюючых у „Ніве" ў апошнюю пятніцу да нядзельных выбараў назіральнікаў з місіі АБСЕ (аб іх візіце ў Беластоку, м.інш. у нашай рэдакцыі, напішам у наступнай „Ніве"). Назіральнікі не скрывалі здзіўлення:

— Гэта дзіўна, мы даведваемся аб гэтым толькі цяпер. Спрабуем гэта высветліць.

Згодна ўказанням Фердынанда Рымажа — старшыні Дзяржаўнай выбарчай камісіі, паводзіны прэзідэнта Трускаляскага і віцэ-прэзідэнта Арлуковіча маглі быць правапарушэннем, што можа спрычыніцца да адмены рашэння аб рэфундацыі кампаніі Грамадзянскай платформы. Нават калі так не будзе, то давыбарчыя дзеянні абодвух гэтых паноў — прынамсі маральна сумніўныя.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Узрастае манаскае жыццё

Размова з ігуменняй Елізаветай (Нічыпарук), настаяцельніцай новаадчыненага Манаскага дома святой велікамучаніцы Кацярыны ў Залешанах Кляшчэлеўскай гміны.

— Вы дзяцінства правялі ў суседняй вёсцы Грабаўцы, з Залешанаў выводзіцца Ваш бацька Сяргей Нічыпарук і ў гэтай вёсцы жыве яшчэ Ваша бабуля Ніна. Ці раней у Вас паяўляліся думкі наконт вяртання ў бацькаўскае сяло?

— Ніколі я не думала, што прыйдзецца сюды вярнуцца. Ідучы ў манастыр, я не разважала, дзе буду жыць, бо ідэя манаства такая самая, незалежна ад месца прабывання. Аднак ёсць радасць, што будзе жаночы манастыр у роднай вёсцы і мясцовыя людзі змогуць прыходзіць сюды маліцца.

— Пасля заканчэння вучобы ў Бельскім белліцэі Вы ў сваім жыцці адразу выбралі манаскую дарогу і адправіліся на жыхарства на Святую Гару Грабарку. Што спрычынілася да такога рашучага выбару яшчэ ў маладым узросце?

— Любоў да Бога і да Царквы. Яшчэ будучы вучаніцай сярэдняй школы, я пачала цікавіцца манаскім жыццём. Раней я асабліва не любіла чытаць свецкіх кніг, але рэлігійная літаратура ўцягнула мяне і завяла на дарогу, якой зараз іду. Я ў духоўных кніжках знаходзіла адказы на пытанні наконт сэнсу жыцця, а ўсё пачалося з прачытання жыція прападобнага Сергія Раданежскага.

— Перад прыездам у Залешаны Вы пабывалі ў розных манастырах.

— З манастыра на Грабарцы я была пераведзена ў праваслаўны прыход у Вайнове і калі ўзнік там Манаскі дом, больш двух гадоў я была яго настаяцельніцай. Пазней 3,5 года я выконвала паслушанні ў Мітраполіі ў Варшаве, дзе закончыла вышэйшую адукацыю на Тэалагічнай акадэміі. Побыт у Грэцыі распачала я ад жаночага манастыра на востраве Самас, пазней пры Універсітэце імя Арыстоцеля ў Салуні вучылася я грэчаскай мове і распачала ў ім адукацыю. Зараз яшчэ, даязджаючы з Польшчы на сустрэчы ў грэчаскі універсітэт, раблю там доктарскую дысертацыю.

— Ужо некалькі гадоў назад распачалася перабудова і рамонт дома ў Залешанах, які спачатку меў быць прызначаны на дом паломніка, а за ўсімі работамі наглядаў настаяцель Мужчынскага манастыра ў Саках архімандрыт Варсанофій. Айцец архімандрыт успамінаў пра залешанскіх жыхароў, якія пасля вайны згарэлі ў падпаленых хатах або былі забітыя людзьмі „Бурага", называючы іх мучанікамі. Можа менавіта дзякуючы іх хадайніцтву перад Богам засеялася ў Залешанах манаскае жыццё?

— Мы верым, што нявінна замучаныя людзі хадайнічаюць перад Богам і хадайніцтва загінуўшых у Залешанах патрэбнае нам, жывым. Аднак напэўна патрэбная і малітва для людзей, што тут загінулі без таінстваў споведзі і прычасця і мы будзем таксама маліцца за іх душы. Напэўна ў жыцці няма выпадковасці і ўсё мае сэнс. Я думаю, што гэта Божы промысел, што менавіта тут паўстае манастыр.

— Сярод загінуўшых у Залешанах хіба найбольш было Вашых сямейнікаў?

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ігумення Елізавета (Нічыпарук)

— Ад пажару загінула бабуля Марыя, першая жонка майго дзеда Мікіты і двух яе сынкоў, якіх яна закрывала ад агню. Адзін хлопчык проста згарэў, а другі задушыўся ад дыму. Хутка пасля пажару памёр трэці яе сын і не выжыла таксама дзіця, якое бабуля Марыя насіла ў сабе ў час пажару. Загінулі таксама брат дзеда Мікіты, яго братавая і іх дзіця. Разам восем асоб.

— Ужо ад нейкага часу вырашалася справа заснавання Манаскага дома ў Залешанах і выбару яго нябеснага заступніка.

— У час мінулагодняга выезду мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы ў Грэцыю, у якім я таксама прымала ўдзел, уладыка пабываў у некалькіх жаночых манастырах і быў пад вельмі станоўчым уражаннем таго, што там убачыў. Тады ўзнікла ідэя заснавання ў Залешанах новага жаночага манастыра. Было некалькі прапаноў наконт нябесных заступнікаў будучага манастыра, але прыезд у Польшчу айцоў з Сіная з мошчамі святой велікамучаніцы Кацярыны быў самым моцным штуршком да выбару гэтай святой нашай заступніцай. Выбар велікамучаніцы Кацярыны гэта гонар і радасць для Царквы ў Польшчы, а для нас жыццё гэтай святой, яе пакуты і любоў да Хрыста з'яўляюцца прыкладам, да якога трэба старацца набліжацца.

— Дом, у якім мы размаўляем, быў перабудаваны раней, але стаяў пустым.

— Наш дом узнік дзякуючы ахвярнасці спонсараў, людзей добрай волі, якія многа бясплатна працавалі пры яго перабудове і адданасці айцоў Мужчынскага манастыра ў Саках, якія хадайнічалі аб прыдбанні фінансавых сродкаў і кіравалі рамонтнымі работамі. Калі мы ўваходзілі сюды на пастаяннае жыхарства, дом быў перабудаваны і атынкаваны ўсярэдзіне. Мы спачатку пачалі збіраць і купляць самыя неабходныя для жыцця прадметы, ад лыжак да ложкаў. Многа дапамагалі нам людзі, якія звярталіся да нас з падарункамі. Абсталявалі мы кухню і прыстасоўваем чарговыя памяшканні. Будзе ў нас „архандарык", абсталяваны на грэчаскі лад, у якім хочам прымаць гасцей. Далей хочам размясціць капліцу для штодзённых малітваў. Знізу будзе таксама кухня і трапезная (сталовая — А. М.), а зверху знаходзяцца манаскія келлі.

— У Вашым доме можна ўжо сустрэць матушак і свецкіх дзяўчат.

— Адна матушка перайшла да нас з Манаскага дома у Вайнове. Некалькі дзяўчат, якія прыязджаюць да нас, цікавяцца манаскім жыццём і можа астануцца на пастаяннае жыхарства. Дапамагаюць нам таксама іншыя матушкі, якія наведваюць нас.

— У кожным манастыры са сваім ухілам ладзяцца заняткі для паслушніц і матушак. Ці можа ёсць ужо ў Вас планы наконт характару манастыра ў будучыні?

— Спачатку хочам заняцца перакладамі духоўнай літаратуры з грэчаскай мовы на польскую. У Грэцыі ёсць багатая рэлігійная літаратура, выпрацоўваецца падыход Царквы да розных праблемаў, якія нясе сучаснае жыццё, хаця б у справах біяэтыкі, ці генетыкі. Прадбачваем таксама заняцца рукадзеллем, бо заняткі трэба будзе прыстасоўваць да ўмеласцей і магчымасцей нашых паслушніц і матушак. Хацелі б мы выконваць крыжыкі з дрэва, іконкі і можа зоймемся вышываннем ікон. Добра было б пачаць выдаваць невялікі часопіс з артыкуламі рэлігійнага зместу, бо не ўсе сёння могуць дазволіць сабе на куплю даражэйшай кніжкі і не ўсе хочуць чытаць аб'ёмістыя кнігі. Прадавалі б мы гэты часопіс як мага танней, каб дайсці з духоўнай літаратурай да самай вялікай колькасці чытачоў.

— Ці прадбачваеце таксама публікацыю артыкулаў на беларускай мове?

— Калі будуць духоўныя матэрыялы на беларускай мове, можна будзе таксама публікаваць артыкулы па-беларуску.

— У Вас ёсць кантакты з грэчаскімі жаночымі манастырамі. Ці прадбачваеце падтрымліваць іх надалей?

— Мы хацелі б падтрымліваць сувязі з грэчаскімі манастырамі і запрашаць да нас прадстаўнікоў Грэчаскай царквы, бо мелі б тады нагоду карыстацца іх багатым вопытам.

— А якія планы ў адносінах да манастыроў з Рэспублікі Беларусь, ці з іншых суседніх усходніх краін?

— Праваслаўе не ведае межаў і, канешне, добра было б наладзіць супрацоўніцтва з манастырамі з нашых зямель, з Беларусі, з жаночымі манастырамі ў Жыровічах, Полацку, ці Навінах (распаложаны побач Мінска — А. М.). Святая Еўфрасіння Полацкая бралася нават пад развагу на нашу нябесную заступніцу. Ведала яна ж добра грэчаскую мову і займалася, так як мы хочам гэта рабіць, асветніцкай дзейнасцю. Мы хацелі б мець таксама кантакты з Расіяй, дзе ёсць многа святых месцаў.

— Ці ёсць можа ўжо нейкія інвестыцыйныя планы на будучыню?

— Хочам канчаць рамонт нашага дома і зрабіць дабудову да яго, у якой памесцілі б начлежныя памяшканні для прыезджых людзей, майстэрню для рукадзелля і гаспадарчыя памяшканні. Плануем парадкаваць тэрыторыю вакол дома і пачаць рабіць агароджу. Калі былі б сродкі ад спонсараў, хацелі б таксама ў наступным годзе распачаць будову невялікай асобнай драўлянай або мураванай царквы, у якой маліліся б таксама людзі з Залешанаў, бо старэйшым цяжка дабрацца нават у Сакі, і жыхары іншых мясцовасцей, якія прыбывалі б да нас. Зараз у святочныя дні мы молімся ў прыхадской царкве ў Саках, а ў буднія дні ў нашым манаскім доме.

— Ці можаце разлічваць на фінансавую дапамогу з Грэцыі?

— Трэба будзе шукаць спонсараў, а ў гэтым ліку і ў Грэцыі. Праваслаўныя грэкі не адзін раз дапамагалі нашай Царкве ў Польшчы і яны радуюцца, калі нешта робіцца для праваслаўя па-за Грэцыяй.

— Людзі з суседніх Тапаркоў і Сакоў многа дапамагалі Мужчынскаму манастыру ў Саках. Як у Вас складваюцца суадносіны з жыхарамі Залешанаў?

— Жыхары Залешанаў многа нам дапамагаюць і іх адносіны да нас вельмі сардэчныя. Людзі прыносяць нам яйкі, агародніну, ці зааруць поле, бо ў нас за домам ёсць участак, на якім хочам вырошчваць агародніну і пасадзіць фруктовыя дрэвы. Ёсць у нас надзея, што такое добрае супрацоўніцтва будзе складвацца і ў будучыні.

— Калі людзі з наваколля або больш аддаленых мясцовасцей схочуць Вам у нечым дапамагчы, як могуць гэта зрабіць?

— Кантактавацца з намі можна па тэлефоне 0 660 148 082 або заехаць да нас, будучы ў Залешанах, а фінансавыя сродкі можна пералічваць на рахунак Bank Spółdzielczy w Brańsku 18 8063 0001 0070 0706 5918 0001, за што вельмі сардэчна дзякуем.

— „Ніву" чытаюць бельскія і гайнаўскія белліцэісткі і іншыя маладыя дзяўчаты. Ці ёсць у Вас магчымасць прыняць на начлег маладых асоб, у якіх пасля прачытання размовы з Вамі паявілася б жаданне паглядзець на манаскае жыццё?

— Ёсць у нас магчымасць прыняць на начлег маладых дзяўчат, але добра было б, каб яны загадзя скантактаваліся з намі.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Новая карта

Нядаўна ў некаторых супермаркетах з'явілася новая каляровая карта Прыбужскага рэгіёна, якую варшаўскі выдавец называе „первой трансграничной картой" гэтай тэрыторыі. Гэта яшчэ адзін прыклад скарыстання еўрасаюзных фондаў на неабавязкова патрэбныя ці разумныя мэты. Напэўна карта прыбужскіх абшараў патрэбная, але карта акуратная, а не такое барахло.

Тэксты падаюцца на трох мовах: англійскай, рускай і польскай. На беларускім баку даюцца кароткія апісанні Брэста, і Кобрына, на польскім — Белай-Падляшскай і Тарэспаля. Чаму гэтыя гарады, а не іншыя — невядома, хаця па абодвух баках мяжы знаходзіцца яшчэ каля 20 гарадоў, часам намнога цікавейшых для турыстаў, чым, напрыклад, Тарэспаль. І яшчэ адно: нават гэтыя сціплыя апісанні падаюцца толькі на адной мове — англійскай. Вялікая шкада! Станоўчай рысай карты з'яўляюцца планы згаданых чатырох гарадоў — гэта несумненна вялікая выгада для турыстаў. На адвароце карты надрукаваны трохмоўны пералік турыстычных цікавінак у паасобных раёнах, што таксама можна палічыць станоўчай рысай выдання.

Маштаб карты 1: 300 000, такі як у сярэдняга дарожнага атласа, не з'яўляецца ніякай сенсацыяй. У атласе турыст знойдзе намнога больш мясцовасцей, чым на згаданай карце. І гэтая заўвага датычыць таксама вёсак, апісаных у інфармацыі аб турыстычных шляхах, напрыклад, Вароблін ці Крычаў. Затое своеасаблівым кур'ёзам з'яўляецца апісанне Яблачынскага манастыра: „Праваслаўны санктуарый, другі (побач Грабаркі) цэнтр праваслаўнага культу з паловы XVIII ст." Прытым праваслаўны цэнтр культу гэта хіба штосьці трохі горшае, бо зараз побач чытаем пра Кастамлоты як пра „Уніяцкі санктуарый" (з вялікай літары) з „арыгінальным іканастасам" зрэшты. Без гарэлкі не разбярэшся.

Абагульняючы: кожная карта, кожны турыстычны даведнік патрэбныя. Але чаму выдаваць дрэнную карту, дрэнны даведнік, калі за гэтыя грошы можна выдаць больш дасканалыя матэрыялы? І не ідзе мне пра ашчаднасць еўрасаюзных сродкаў, наадварот, павінны мы цягнуць грошы з Еўрапейскага Саюза колькі можна, але прытым нельга іх марнаваць на дрэнныя праекты, калі можна выдаць штосьці сапраўды каштоўнае.

І на канец яшчэ адна заўвага: чаму на карце няма ніводнага слова пабеларуску? Ці жыхары Прыбужскага рэгіёна штодзень карыстаюцца іншымі мовамі, асабліва англійскай? Менавіта назвы на ўсходнім баку Буга напісаны на гэтай мове. Ужо ўяўляю сабе палескага калгасніка, які з гонарам заяўляе, што жыве на тэрыторыі „Pribuzhskoye Polesye Biosphere reserwe"!

М. Ц.

Культура ў Белавежы

Размова з Людмілай КАНЭЦКАЙ, выконваючай абавязкі дырэктара Белавежскага асяродка культуры.

— ***Якія галоўныя мерапрыемствы праводзіць Ваш асяродак?***

— Гэта ў першую чаргу Ноч Купалы; сёлета адбыўся дваццаць трэці выпуск гэтай імпрэзы. Ладзілі мы яе супольна з Гміннай управай і Беларускім грамадска-культурным таварыствам...

— ***Калісь Ноч Купалы адбывалася на пероне чыгуначнай станцыі Белавежа-Палац. Зараз станцыя раскідана...***

— З 2004 года на аўтастаянцы, што недалёка былога вакзала, раскладаем мабільную сцэну і на ёй праводзім нашы мерапрыемствы. Сёлета падвяло нас надвор'е і публікі было менш чым у ранейшыя гады, але ўсё ж такі мяркую, што было пад паўтары тысячы гледачоў.

Чарговым мерапрыемствам было Ператоча, у канцы ліпеня, сёлета пяты выпуск. У ліку арганізатараў былі Фонд царкоўнай музыкі і Белавежскі нацыянальны парк.

Наш асяродак патрануе Бегу зубра; сёлета адбываецца яго дванаццаты выпуск. Галоўным яго арганізатарам з'яўляецца Спартыўнае таварыства „Зубр". Мерапрыемства збірае каля 320 удзельнікаў. Гэта моладзь нашых і запрошаных школ, напрыклад, з Нараўкі. Мерапрыемства адбываецца ў чатырнаццаці катэгорыях; да ўдзелу дапускаюцца толькі тыя вучні, якія з задавальняючым вынікам пройдуць ранейшы медыцынскі агляд.

Сёлета ўпершыню ладзілі мы Музычную суботу — развітанне з канікуламі. Адбылася яна ў пленэры, на згаданай раней аўтастаянцы. Было гэта мерапрыемства для моладзі, ад 18-й да 23-й гадзіны; але гулялі і пяцідзесяцігодкі. Музыку дыска-пола іграла два калектывы: „Дэнім" з Бельска-Падляшскага і „Red Star" з Ломжы. Здаецца мне, што імпрэза ўдалася, бо пасля яе атрымала я шмат тэлефонаў, каб такую забаву ладзіць і ў будучыні.

— ***А якія меншыя мерапрыемствы адбываюцца яшчэ ў Вашым асяродку?***

— У студзені ладзім навагоднюю батлейку, у якой прымаюць удзел вакальныя калектывы з нашых школ і прыходаў. У час зімовых канікул арганізуем пластычныя заняткі для дзяцей. Карыстаюцца яны таксама настольнымі гульнямі.

У прагульны дзень, 21 сакавіка, бясплатна паказваем дзецям фільмы ў нашым кіно „Зубр". Гэта адна з альтэрнатыў прапанаваных на той дзень школьнай моладзі і прыцягвае яна даволі многа ахвотных.

Разам са школамі: дзіцячым садком, пачатковай школай, гімназіяй і Лясным тэхнікумам арганізуем у зале нашага кіно Дзень маці. У аўдыторыі 157 месцаў, а калі даставім крэслы, тады спектакль можа глядзець нават дзвесце асоб. Зацікаўленне гэтым мерапрыемствам вялікае, бо ж апрача сваіх дзетак запрашаем таксама гасцей з Пружан.

У красавіку ладзім велікодныя майстар-класы, на якія людна прыходзяць не толькі дзеці, але і дарослыя. У час гэтых заняткаў наша мастацкая інструктар паказвае спосабы выконвання пісанак.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Людміла Канэцкая

У перыяд летніх канікул арганізуем заняткі тройчы ў тыдзень. Сёлета напрыклад, між іншым, медсястра правяла гутарку на тэму „Радасць без алкаголю". У гэтых рамках адбываюцца адукацыйныя заняткі, напрыклад, прыёмы вязання вянкоў. Таксама былі кулінарныя заняткі пад лозунгам „Прыгадваем смакі страў нашых бабуль". З панядзелка да пятніцы можна тады пагуляць у пінг-понг і настольны футбол. Гуляе не толькі наша моладзь, але заглядаюць да нас і турысты. Таксама ў бібліятэцы маем тры камп'ютэры, якімі можна бясплатна карыстацца ў рамках праграмы „Іконка".

У верасні наша бібліятэка запрашае да сябе дашкольнікаў і першакласнікаў, каб пазнаёміць іх з бібліятэчнай справай; бібліятэчныя ўрокі праводжу таксама ў школе. З верасня пачынаюцца таксама заняткі пластычнага гуртка „Крэдка", якія адбываюцца тройчы ў тыдзень. Далей ладзім аднадзённыя асеннія майстар-класы, на якіх дзеці знаёмяцца з кампазіцыяй „дароў восені": лісткоў, каштаноў, жалудоў.

У лістападзе ладзім Дзень сеніёра, на які нашы старэйшыя людзі запрашаюць калег з Гайнаўкі, Нараўкі і Беларусі; з Пружан прыязджае да нас каля трыццаці асоб і даюць яны ў нас канцэрт.

Штогод Белавежскі асяродак культуры разам з вучнямі рыхтуе мастацкую пастаноўку з нагоды „Залатых вяселляў". У канцы лістапада арганізуем Андрэйкавае гулянне. На дзень 11 лістапада вучні Лясного тэхнікума рыхтуюць прымеркаваны да гэтага свята спектакль.

Апрача мерапрыемстваў праводзім пастаянныя заняткі. Апрача згаданай ужо „Крэдкі" ў суботы і нядзелі паказваем у нашым кіно фільмы; на жаль, збіраецца на іх нямнога публікі. У буднія дні працуе бібліятэка а ў ёй можна карыстацца Інтэрнэтам. Па чацвяргах адбываюцца ў нас сустрэчы Клуба сеніёра, які налічвае каля сарака асоб. У першую і трэцюю суботы месяца сустракаюцца ў нас члены Клуба ананімных алкаголікаў. Раз у месяц адбываецца інфармацыйная сустрэча хворых дыябетам. Ну і наш асяродак выдае штомесячнік „Głos Białowieży".

— ***Ці ў Вашым асяродку дзейнічаюць нейкія мастацкія калектывы?***

— На жаль, уласных калектываў у нас няма. Наша надзея ў праекце „Równać Szanse", у рамках якога хочам згуртаваць любіцеляў музыкі і танцаў. Хочам хадайнічаць за сродкамі, якія б дазволілі прыцягнуць для гэтай мэты маладых людзей і заахвоціць іх да гэтага віду мастацтва. Ужо дамаўляемся з харэографам з Беларусі, якая 25 гадоў вядзе калектыў „Спадчына" ў Пружанах. Грошы на строі і аплату інструктара маем. Цяпер асталося адно прыцягнуць 12-16 маладых людзей з нашых Гімназіі і Лясного тэхнікума.

— ***Ці ў вёсках Белавежскай гміны працуюць святліцы?***

— Ёсць тры вясковыя клубы: у Падалянах, Пагарэльцах і Тэрасках, ім шэфствуюць тамашнія салэцкія рады. У час канікул часам ладзяць у іх дыскатэкі.

— ***Можа ёсць там і бібліятэчныя пункты?***

— Калісь былі, але зараз няма. Бібліятэка толькі ў Белавежы, з двух паверхаў: адзін для моладзі і дзяцей, другі для дарослых. Нашымі фондамі карыстаюцца 393 асобы, але чытальніцтва падае. У чытальнай зале маем энцыклапедыі, лексіконы, прэсу. Пра беларускія выданні ніхто не пытае.

— ***З якімі ўстановамі супрацоўнічае Ваш асяродак?***

— З Гміннай управай, з гміннымі школамі, з Лясным тэхнікумам, Белавежскім нацыянальным паркам, Надлясніцтвам, Домам сацыяльнай апекі.

— ***Белавежу наведвае многа людзей з усяе Польшчы. Ці з боку турыстаў былі можа нейкія заяўкі, можа нейкая зорка польскай сцэны хацела паказацца ў Белавежы?***

— З такімі прапановамі ніхто да нас не звяртаўся.

— ***Ці здабываеце спонсараў на свае мерапрыемствы?***

— Сёлета паслала я заяўкі ў трыццаць фірмаў, што дзейнічаюць у Белавежы. І ніякага водгуку не было ад іх. Толькі ад невялікіх агратурыстычных прадпрымальнікаў было крыху невялікай падтрымкі.

— ***Ці на беларускім напрамку Ваш асяродак супрацоўнічае толькі з Пружанамі, даваенным цэнтрам павета, у якім была Белавежа, ці можа таксама з іншымі асяродкамі?***

— Супрацоўнічаем толькі з Цэнтрам культуры ў Пружанах і з гэтым партнёрам дамаўляемся непасрэдна. У палове жніўня з Пружан прыязджалі да нас тры калектывы: народны калектыў „Бабіна лета", танцавальны калектыў „Спадчына" і вакальны „Пружаначка".

— ***А з Вашага боку няма каму да іх паехаць...***

— Гэта мой боль. Я калісь, у 1970-х гадах, сама выступала ў Калектыве песні і танца „Белавежа", былі гастролі. З таго часу ў нас застой.

Хачу падкрэсліць, што наш войт Альберт Літвіновіч вельмі прыхільна ставіцца да нашых ініцыятыў, вельмі хоча, каб культурная прапанова была ў нас багатая.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Ліпскі каравай цыцаты

Міра ЛУКША

Пасля хуткага падарожжа па Дуброўшчыне ўязджаем у цёмна-фіялетавую хмару, бачную нам здалёк на асеннім небе. І якраз калі мінаем праваруч адзіную праваслаўную вёску ў гэтай ваколіцы, Ялова, упускае на нас тая хмара кроплі дажджу. Гэта ўжо крок да Ліпска над Бобрай. Мы імчымся па каравай, на вяселле для нашых сяброў Домны і Юркі, да Яніны Трахімовіч. Адразу ведаем: тая вуліца старажытнага Ліпска гэта 400-годдзя, другая вуліца направа ўязджаючы ў горад, „леваруч другі жоўты слупак", нумар дому 44. Той „слупак" гэта вялікі дом майстрыхі на ўсе рукі, а папраўдзе цэлага роду майстрых, якія, па-сучаснаму, пра сваё майстэрства аб'яўляюць і ў Інтэрнэце. І пані Яніна, і яе дачка Агнешка, і бабуля Зося. А пані Яніна адразу паведамляе, што ведае сям'ю Валі і Юркі Панасэвічаў, адзіную поўнаправаслаўную сям'ю ў горадзе, і што яны перасяліліся з блёку ў свой новы дом на Галоўнай вуліцы. Ведае і Валіну бабулю, Веру Лявіцкую, якой больш за 93 гады, вядомую з фільма „Крэсавая балада" Тамары Саланевіч, знахарку-вядунню ды пявунню розных абрадавых песень. Бо баба Вера ведае і тыя пра каравай. Не заспявае іх, праўда, пры тым, як Трахімовічкі пякуць караваі, бросанкі, выхапенькі, красяць і здобяць яйкі, бо неабходныя песні майстрыхі запісалі на магнітафоне і гучаць яны ў час гібання каравая і яго пячэння.

На круглым стале, у салоне, сярод расстаўленых наўкруг грамат у рамках стаіць ён, высокі, залацісты, пухнаты, з гусачкамі да пары, з чатырма каласамі накіраванымі ў чатыры стораны свету, з гняздзечкам пасярэдзіне, абвязаны белай атласавай стужкай з галінкамі аспарагуса, як здавён належыцца тутэйшаму караваю. Гатовы, спечаны пад песні бабулі Веры. А граматы — за кулінарную творчасць, за ўдзел і прэміі на ваяводскіх аглядах „Нашай кулінарнай спадчыны". Ваяводскі фінал арганізаваўся сёлета ў сёмы раз. Першая ўзнагарода — такі вясельны каравай, з гусачкамі і гняздзечкам, аплецены залатою касою. Кожны элемент мае сімвалічнае ды магічнае значэнне. І тыя песні маюць значэнне, і тыя, хто пячэ каравай (хай гэта будуць шчаслівыя, заможныя, дзетныя, гаспадарлівыя кабеты): *Белая муку сее, харошая расчыняе, а багатая ў печ саджае. Расці, расці, караваю, вышэй таго гаю, вышэй тое печы, каб было чатыром легчы каравая сцярэгчы... Расці, караваю, высокі, цыцаты... А дзе ж тыя кавалі, што зялезныя сякеры? Хай ідуць печ рубаюць, каравай вымаюць!.. Ой, ніхто не ўгадае, што ў нашым караваі: цэбар вады крынічнай, мяшок мукі пшанічнай...* І расце той „каравай цыцаты", можа, не такі вялікі, каб печ ламаць яго дастаючы, бо і ж не на цэбры вады крынічнай яго замешвалі. Калісьці, дастаўшы з печы каравай, тры разы стукалі ў столь, каб хлебная лапата трэснула. Ставілі каравай на века ад дзежкі, на якое спачатку насыпалі жыта, а пасля накрывалі надзежнікам. Спявалі песні ўвесь час, звяртаючыся да каравая як да жывой істоты. Калі астываў, каравайніцы абцягвалі яго ручніком і ўтыркалі ў яго фігуркі. Увесь час прасілі ў Бога, каб маладым даў шчаслівую долю. Выносілі каравай у камору. Каравай выкупляў брат маладога. Падавалі каравай пасля распісання і вянчання, перад гэтым, як сесці за сталы...

Яніна Трахімовіч з Ліпска — найвялікшая майстрыха ў пячэнні каравая

— Гусачкі гэта багацце, птушынае гняздо — новаўзніклая сям'я, — як найпрасцей тлумачыць майстрыха.

Як самому спячы беларускі каравай? Невялічкі. Патрэбны:

10 шклянак мукі, 100 грамаў дражджэй, 4-5 шклянак малака, 8 яек, 1 шклянка смятаны, 100 грамаў масла, 100 грамаў разынак, 1 лыжка мёду, соль. Падрыхтаваць рошчыну: дрожджы распусціць у цёплым малацэ, дадаць соль, усыпаць палову мукі і дакладна размяшаць да аднародага цеста. Рошчыну паставіць у цёплым месцы на 2-3 гадзіны. Калі падымецца і стане ападаць, пакласці ў яе мёд, яйкі, разынкі, смятану і масла. Вырабляць цеста, падсыпаючы рэштай мукі, пакуль не стане адставаць ад сценак посуду, пасля паставіць яго ў цёплым месцы. Калі вырасце ў два разы, загібаць яго і зноў паставіць каб далей расло. Наступным чынам выбіць яго на стале і пакласці ў форму пашмараваную маслам. Верх бохна аздобіць фігуркамі з цеста і пашмараваць яйкам або адным жаўтком. Пячы ў духоўцы 30-40 хвілін, у тэмпературы больш-менш 180 градусаў, каб узнікла на пірагу румяная скурачка. Фігуркі — гусачкі, бусліныя лапы, касу — робіцца з гусцейшага, больш сціслага цеста... У час пячэння нельга каравай трывожыць — трасці, расчыняць духоўку ці печку, каб не апаў. Духоўку выключыць, астудзіць каравай каля 15 хвілін, не дастаючы яго з духоўкі. Каравай дастаць, пакласці на талерку накрытую папяровымі сурвэткамі (каб не падмок ніз), памазаць маслам ці падсалоджанай вадой. Зверху пакласці папяровыя сурвэткі і накрыць палаценцам, пакінуць каравай „адпачыць" на ноч. Гэтак „пасённяшняму" можам зрабіць сабе кулінарнае свята...

Каравай, выкананы спадарынямі Янінай і Агнешкай Трахімовіч пад песні бабулі Веры Лявіцкай зрабіў аграмадны фурор на вяселлі! Красаваўся ён перад маладымі на самым шаноўным месцы. Падзялілі яго паміж вясельнікамі — кавалерам і паненкам дасталіся кавалачкі з гусачкамі. Гэта на будучае шчасце!

1 ☞ працяг

Хто зараз кіруе музеем?

размовы паміж нашым аб'яднаннем, а прадстаўнікамі БГКТ аб вырашэннях наконт уласнасці музейных будынкаў на фінішы (здаўна ГП БГКТ было ўласнікам участка, на якім будаваўся музей, а справа завязалася, калі пастановай суда БГКТ стала таксама юрыдычным уласнікам і музейных будынкаў, аб чым мы раней пісалі ў „Ніве"), — паінфармаваў Міраслаў Мордань, але не хацеў дакладней растлумачыць нашым чытачам, на якія ўступкі згодны абодва бакі. — Калі мы былі б уласнікамі музейных будынкаў, маглі б выступаць у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі таксама за сродкі на штаты для музея і частковае ўтрыманне будынкаў. Маглі б таксама ўносіць большы ўласны ўклад да праектаў па культурнай дзейнасці, фінансаваных з еўрасаюзных сродкаў.

Віктар Бура прадставіў некаторыя свае прапановы наконт ліквідацыі фінансавых цяжкасцей гайнаўскага музея.

— Музею патрэбны бізнесплан, паводле якога можна дзейнічаць. Добра было б вярнуцца да вялікай колькасці членаў музейнага аб'яднання, бо раней са складчын збіралася многа грошай. Трэба таксама шукаць спонсараў, якія фінансава ўспамаглі б музей.

Аляксей Харкевіч таксама звяртаў увагу на патрэбу бізнесплана для музея. З пытаннямі пра бізнесплан і канцэпцыю дзейнасці ў будучыні звярнуўся я да старшыні Міраслава Морданя.

— Бізнесплана няма, але ёсць ужо праекты выкарыстання музейнай плошчы і часткі памяшканняў музея. Ёсць таксама планы паляпшэння фінансавых умоў дзейнасці музея. Побач музейных будынкаў хочам збудаваць скансэн і адрамантаваць памяшканні ззаду музея. У гэтых будынках і скансэне ўзніклі б гасцінічныя месцы, — паінфармаваў Міраслаў Мордань.

Назіральнікі справы музея сказалі мне, што ўжо здаралася, што размовы аб палюбоўным вырашэнні ўласнасці музейных будынкаў былі на фінішы, а пасля перарываліся без канкрэтных пастаноў. Трэба спадзявацца, што на гэты раз абодва бакі дойдуць да згоды. Узнікае аднак пытанне ці гэтае паразуменне будзе карысным беларусам Беласточчыны і ўсяго свету, якія фінансавалі будову музея на працягу многіх гадоў. Застаецца яшчэ без адказу пытанне як было сапраўды з адстаўкай дырэктара, бо выказванні маіх суразмоўцаў супярэчлівыя.

Памяці Т. Касцюшкі

15 кастрычніка 2007 года ў Варшаве адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя 190-ай гадавіне смерці Тадэвуша Касцюшкі, арганізаваныя Польскім фондам імя Т. Касцюшкі і Таварыствам пабудовы помніка Т. Касцюшку ў Варшаве.

Ва ўскладанні кветак да урны з сэрцам Т. Касцюшкі ў малахітавай зале Каралеўскага замка прынялі ўдзел прадстаўнікі Канцылярыі Прэзідэнта Польшчы, Міністэрства абароны Польшчы, мэры Варшавы, пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, прадстаўнікі Пасольства Расіі, прадстаўнікі Брэсцкай вобласці, польскіх грамадскіх арганізацый, ліцэяў і школ.

У Варшаўскім музеі Незалежнасці адбыліся адкрыццё фотавыстаўкі з цыклаў „Родная зямля Т. Касцюшкі" (аб Мерачоўшчыне Брэсцкай вобласці) і „Святкаванне ў 2007 годзе гадавіны польскага паўстання" старшыні Польскага фонду імя Т. Касцюшкі Марка Кшэсняка, а таксама канферэнцыя, прысвечаная Т. Касцюшку.

У ходзе мерапрыемстваў неаднаразова падкрэсліваўся факт нараджэння Т. Касцюшкі на беларускай зямлі, станоўча адзначалася дзейнасць, якая праводзіцца ў Беларусі па захаванню гістарычнай памяці аб Т. Кастюшку, была выказана ўдзячнасць Пасольству Беларусі за ўдзел ва ўрачыстасцях.

Сямятычы і Паставы

13 кастрычніка 2007 года ў Гарадской управе горада Сямятычы адбылося падпісанне пратакола аб намерах па наладжванню супрацоўніцтва ў эканамічнай, культурнай і іншых сферах паміж горадам Сямятычы і горадам Паставы. Пратакол падпісалі бургамістр г. Сямятычы Збігнеў Радомскі і кіраўнік дэлегацыі Пастаўскага раёна Наталля Булавінцава. На цырымоніі прысутнічалі саветнік Пасольства Беларусі ў Польшчы Тадэуш Стружэцкі, намеснік старшыні Таварыства Польшча — Беларусь Юзэф Брыль, прадстаўнікі ўлад двух гарадоў.

Падпісанне пратакола адбылося па ініцыятыве Таварыства Польшча — Беларусь і Пасольства Беларусі.

З вялікай і цікавай канцэртнай праграмай перад жыхарамі горада Сямятычы выступіў заслужаны аматарскі калектыў Беларусі, ансамбль народнай музыкі „Паазер'е" з г. Паставы Віцебскай вобласці.

Прэс-служба Пасольства РБ

У Бэрнацкім Мосце

Жыхары вёскі Бэрнацкі Мост (Гайнаўскі павет) дачакаліся новага вулічнага электраасвятлення. На вулічных слупах завінцілі новыя электралямпачкі і абажуры — разам 12 электраўстановак.

Зараз асеннім вечарам прыемна і бяспечна ісці вуліцай. Толькі ў адным месцы неабходна ссячы высокія кусты ў прыдарожным рове, бо яны засланяюць святло электралямпачкі.

Пра новае асвятленне вуліцы ў гэтай прыбелавежскай пушчанскай вёсцы паклапаціліся радныя і войт Нараўчанскай гміны.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Зольтан

Аднойчы я паказала цёці здымак Зольтана, сябры з класа. З гэтай пары, калі цёця прыходзіць у госці, яна заўсёды просіць паказаць яго фотку...

Мая цёця не першая і не апошняя асоба, якую зачараваў хлапец. Зольтан падабаецца амаль усім дзяўчатам, асабліва тым, якія яго слаба ведаюць. Спачатку ў нашым класе ўсе яго абажалі. Але праз нейкі час, калі мы пачулі нецэнзурныя тэксты гімназіста, апамяталіся. Зараз, менш захапляемся.

Зольтан ніколі не меў дзяўчыны. Мне здаецца, што ён шукае такой як ён сам: прыгожай і касмічнай...

З-за красы Зольтана наш клас ужо шмат разоў пацярпеў. Проста, усе дурноты, якія ён выказвае ўголас, прыпісваюць іншым. Часам нават дзяўчатам! Хлапец карыстаецца гэтым сляпым захапленнем. Ён як адзін у класе не вядзе сшыткаў і часта засынае на ўроках. А найбольш спадабала яго настаўніца літаратуры Ева Дубашэвіч. Яна прыкмеціла ў гімназіста літаратурны талент. Зольтан, вядома, быў вельмі ўзрушаны прызнаннем і адразу стаў пісаць гісторыі пра людзей з нашага класа. На жаль, яны былі насычаныя вульгарызмамі і я не магла пахваліцца сваёй „карцінкай" бацькам.

Не ўсе могуць ганарыцца сяброўствам з Зольтанам. Ён сам сябруе толькі з Філіпам, Бэрцікам і Якубам, якіх ведае яшчэ з дзіцячага садка. Хлопцы з майго класа вельмі стараюцца, каб той зірнуў на іх ласкавым вокам. Мне здаецца, што Зольтан толькі павярхоўна іх успрымае за сяброў, папраўдзе, ніхто не мае шанцу папасці ў яго круг!

Спачатку мы з Лёляй таксама хацелі пасябраваць з прыгажуном. Хлапец адразу зірнуў на нас зверху. Мала таго — ён стаў у нашай кампаніі капрызнічаць...

— У цябе надта вялікі прышч на тварыку, — дакараў мяне і стаў паказваць дурныя міны. У Лёлі не спадабаўся колер валасоў, а пасля яе прычоска. І так было кожны дзень!

Апошнім часам мы таксама сталі капрызнічаць. Мы выказалі радасць з таго факту, што ўжо апошні год разам у адным класе...

— Так лёгка не будзе! — агрызся нам Зольтан. Што гэта значыць?

Можа дырэктарка ліцэя (куды збіраемся мы з Лёляй), як і нашы настаўніцы, заўважаць прыгажосць і талент хлапца ды, нягледзячы на яго ацэнкі, прымуць яго ў школу?!

truskawka9922@tlen.pl
lolcia05@tlen.pl

У Чыжах гуляем разам

Вучні малодшых класаў Пачатковай школы ў Чыжах разам з настаўніцамі Валянцінай Андрасюк, Барбарай Юрчук і Крыстынай Койла сабраліся ў адзін сонечны дзень кастрычніка ў самай вялікай і каляровай школьнай зале — ад зусім маленькіх дашкольнікаў да чацвёртакласнікаў пагуляць разам ды паразмаўляць. Запрасілі да сябе ў госці Міру Лукшу, пісьменніцу, вядомую ім перш за ўсё са старонак „Зоркі". Падрыхтавалі таксама дэкламацыі яе вершаў для дзяцей, паслухалі іх у яе выкананні, а і самі спрабавалі складаць вершы — выдумлялі вельмі файныя рыфмы ва ўласных вершыках пра тое, што іх найбольш цешыць і смешыць. Пахваліліся таксама сваімі творамі ў пару галінах мастацтва — цудоўнымі рыфмаванкамі-маляванкамі — пра дожджык намаляваў Міколка, пра міся-Пыся — Матвейка, пра мішку — Наталька з Мора, пра коціка Мручка-Кручка — Аня, пра слоніка — Гося, пра мушку — Марыя, пра сонейка — Моніка, пра Олю — сама Оля, пра коніка-тэлефоніка — Сільвія, пра качку — Эвеліна... І выдумлялі рыфмаванкі са сваімі імёнамі. Мартынка Марчук прачытала свой доўгі вершык пра вясну. Каралінка Марчэўская — пра дзіцячы пакой з цацкамі. І Бэата Красько ўключылася сваім ціхім галаском са сваім вершыкам. І баявіты Крыстыян Герасімюк імправізаваў пра коціка-плоціка ды да таго... пляткара. Першай выступіла з дэкламацыяй Мажэна Дмітрук з зімовымі вершамі Міры Лукшы пра катка на катку ды снегавіка. І пайшлі вершы пра поры года — пра вясеннюю лотаць і іншае. Дзецям вельмі падабаліся вершы пра вядомыя персоны — птушак — дзятла, вераб'я, варону, а найбольш пра коцікаў, пра зайчыкаў. Разам гулялі ў зайца і ваўка і пры беларускіх гульнях — пра мышку („мышка-мышка, дзе была?..."), пра ваўка і авечак, пра гномікаў, у двух маленькіх мішак. Як жа хочацца паварушыцца, павесяліцца ў школе! Паскакаць, папляскаць у ладкі!..

Меншыя чыжоўскія вучні з настаўніцамі

Дзеці пыталіся ў аўтаркі пра тое, што іх цікавіла: ці пачала пісаць у іх узросце, калі адбыўся яе дэбют у „Ніве" і як доўга там працуе, пра малую айчыну — ці часта туды ездзіць, пра зацікаўленні (і ці мае і такія зацікаўленні, як і ў іх), пра вольны час, пра журналісцкую працу. Ды перш за ўсё хацелася хлопчыкам і дзяўчаткам сказаць вершыкі — і свае, і завучаныя. Перш за ўсё свае — зрабіўся вельмі вясёлы і творчы настрой! На дварэ падымалася сонейка, на асеннім ветрыку трапяталі каляровыя лісты. Гаманліва і весела было ў Чыжах у гэты час!

Тэкст і фота (лук)

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК ДОЖДЖЫК ЗМЯНЯЕ ВЯСЁЛКУ

Сябры мае! Толькі не падумайце на пачатку або ў канцы, што мая новая гісторыя вельмі сумная. Гэтая гісторыя вясёлая і добрая. Таму што толькі ў добрых гісторыях хлопец кахае дзяўчыну, нават калі тая дзяўчына — нямая.

Ну так, жыла на свеце нямая дзяўчынка, якую звалі Васілінка. І жыў хлопчык, якога звалі Марат. Звычайны такі Марацік, які проста кахаў. Не, кахаў не проста, а незвычайна, адчайна, прыгожа. Так прыгожа, што нават сонейка плакала, калі бачыла вочы Марата, дзе адбіваліся вочы Васілінкі, якія так шмат хацелі сказаць, але толькі маўчалі, маўчалі...

І калі вось так плакала сонейка — цёплыя кроплі ляцелі, падалі на зямлю, а Маратка кранаў сонечныя тыя струмені сваімі рукамі, сваімі пальцамі — і гучала там музыка, Госпад Мой Божа, якая гаючая музыка тады гучала!.. І Васілінка, нямая Васілінка — яна ж была не глухая. Яна чула, усё яна чула, і плакала, таксама плакала, як той сонечны дожджык, як сонейка, як увесь гэты свет, які таксама плача, калі плача і смяецца каханне.

Толькі што яна магла адказаць яму?! Што яна магла яму даць, што падараваць за тую цудоўную музыку, за тыя пяшчотныя струмені, якія ліліся, ліліся і гаварылі, гаварылі...

Але, калі яны спыняліся, калі заканчваўся гэты дождж, гэты смех, гэты цуд і такое светлае, чыстае такое спатканне, — ад неба да неба, ад хаты да хаты, ад зямлі да зямлі, — усё накрывала вясёлка. Накрывала і трымалася да той самай пары, пакуль Васілінка не заплюшчвала вочы. А калі яна іх заплюшчвала — зноў пачынала плакаць сонейка, а Маратка зноў пачынаў іграць на струменях свайго нескончальнага дажджу, дажджу свайго такога прыгожага і кранальнага такога кахання.

Ваш Дзядзечка Сід
30 верасня 2007 г., Кобрын

Фота Матфея Севастьяніка

Музыка з кайфам

імёны „РІМЫ"

У нашай чацвёртай вандроўцы па розных беларускіх сцэнах трэба ўрэшце спыніцца на нашым Падляшшы. Напэўна не адзін раз будзем сюды вяртацца і яшчэ да гэтага ў Гарадок. У пэўным сэнсе з Гарадка пачалі мы, калі гаварылі пра фестываль „Басовішча". Цяпер заглянем у Цэнтр культуры ў Гарадку, які яшчэ нядаўна называўся Гарадоцкім асяродкам культуры і пад такой назвай вядомы шматлікім асобам, якія ведаюць творчасць гуртоў „РІМА" і „5сот5".

У 2000 годзе ў конкурснай частцы фестывалю „Басовішча" з'явілася пару гуртоў, якіх і журы, і слухачы ацанілі даволі высока. У іх ліку апынуўся наш гарадоцкі, маладзенькі тады гурт „РІМА". Падумайце! Першая рэпетыцыя адбылася 14 лютага ў асяродку культуры, а ўжо з ліпеня пачалася іх кар'ера. Канцэртавалі ад гораў па мора, з'ездзілі многа месцаў, а адным з большых дасягненняў напэўна быў канцэрт у час найбольшага фестывалю ў Польшчы: Прыпынку Вудсток. Але ўсё залежыць ад пункту гледжання. Канцэрт фактычна быў важным момантам у іх творчым жыцці, але самае важнае, па-мойму, што працуюць ужо сем гадоў, безупынна. Да гэтага моманту ўдалося ім запісаць дзве кружэлкі: „Праз жыццё" (2001 г.) ды „Прадаем сябе" (2003 г.). Самае галоўнае, што апрача музычнай працы музыкі з сабой сябруюць, а як самі заўсёды кажуць, граюць разам каб рэалізаваць свае музычныя думкі і мары ў добрай атмасферы. На працягу гэтых гадоў меў месца яшчэ адзін важны момант. У верасні 2004 года з гурту адышоў бас-гітарыст Раман Карповіч, а заступіў яго Марк Ядкоўскі. Калі ўжо гавару пра музыкаў, то варта сказаць, хто ў гурце іграе, бо гэта мае значэнне для назвы каманды. **Р** як Раман (бас), **І** як Ігар (гітара), **М** як Марцін (гітара), а цяпер і Марк (бас), **А** як Андрэй, якіх у гурце двух (бубнач і вакаліст). Неразлучным сябрам, якога ўжо адкрыта называюць членам гурту, з'яўляецца Джузва. Ён найчасцей дапамагае пры тэхнічным абсталяванні і пабываў амаль на ўсіх канцэртах свайго любімага гурту. А што цікавага на сённяшні дзень? Якраз гурт завяршае працу над сваім трэцім альбомам, які напэўна зможам пачуць яшчэ да канца года.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Малодшая барада

Унук дзедку пытае:
— Адкажы ты, дзедка, мне,
Чаму галава сівая,
А барада яшчэ не?

— Дзетка ты мой салодкі,
Адказ я табе знайшоў:
Малодшая бародка
На васемнаццаць гадоў.

Прыкусі язык

— Ты балбочаш і балбочаш,
Маўчаць не прывык.
Дык скажу табе, сыночак,
Прыкусі язык.

Было гэта немінуча,
Сын балбоча зноў.
Прыкусіў язык балюча,
Тады роў і роў.

Польска-беларуская крыжаванка № 43



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 39: Дух, ганак, ара, тамат, рынак, тут, цэнтр, нара, атаман. Дах, рэч, тын, бант, мара, грак, на, там, ар, ура, кафтан.

Узнагароду, **фільм «Канцэрт „Салідарныя з Беларуссю"»**, выйграў **Лукаш Сцепанюк** з Гайнаўкі. Віншуем!

Ванеўская даўніна

Легенда пра пачатак Ванева кажа, што першы ваневец „сядзеў на Грудкові за Бродом”, а Грудок той абшарам у дзве валокі (каля 40 га) знаходзіўся ў міжрэччы рачулкі Рудні (правы прыток Нарвы) і ручая Ванеўка, ад якога і мела назву сяло. Пасля Ванеўкі застаўся цяпер толькі лог, на Грудзе лічыцца найлепшая зямля з усяго сяла.

У пісьмовых помніках Ванева ўпершыню ўпамінаецца ў 1560 годзе, як „село места Нарві”. Гэта вялікі князь літоўскі, кароль польскі Жыгімонт I загадаў ваяводу троцкаму Альбрэхту Гаштольду заснаваць на Вялікай Дарозе з Каралеўства Польскага ў Вялікае княства Літоўскае горад, у якім каранаваныя асобы ды іншыя „путнікі” знайшлі б адпаведны іх патрабаванням прыпынак, начлег, адпачынак і нават уцеху. І Нарва стала такой значнай мясцовасцю. У 1576 годзе кароль Стэфан Баторый пацвердзіў магдэбургскае права „месту Нарве”.

Багатае і складанае мінулае Ванева наслаілася ў назвах урочышчаў: *Бояршчына, Броварыско, Бэрэзіна, Воўча Яма, Глінішчэ, Глубокі Луг, Гуткоўшчына, Залужжэ, Зюўшчына, Кімбароўка, Крушка, Подрэка, Міханёўшчына, Нараўскі Луг, Попоўшчына, Подяковіна, Пэчыско, Зэлезоўшчына.*

Варта прыгадаць, што пад назваю *Бояршчына* тоіцца след таго, што гэтая зямля належала нейкаму баярыну (так называлі дробных шляхцічаў у Вялікім княстве Літоўскім). Пад *Зэлезоўшчынай* трэба бачыць месца, дзе калісьці здабывалі балотную руду, а, магчыма, што і плавілі жалеза. Каля Ванева была ганчарня ды на рэчцы Рудні — млын, там працаваў таксама фолюш.

Не абміналі Ванева ніякія нягоды. Іх водгулле захавалася ў паданнях, хаця б пра ўрочышча *Крушка*, назва якога ўзялася ад таго, быццам у час голаду, што некалі спасціг Ванева і ваколіцы, гэты значны абшар зямлі ўладальнік прадаў за „акрушку” (акрайчык) хлеба. Або пра незвычайную хвою, што вырасла ў *Бэрэзіне* на „поморковых” могілках. Адзін з ванеўцаў ссек яе, але потым з-за таго адсохлі яму рукі.

У тутэйшых сялянскіх родаў (Апольскі, Глінскі, Вашкевіч, Касакоўскі, Новік, Ярмоцік, Федарчук, Снарскі, Сікорскі, Паскробка, Русіловіч) уся гісторыя запісана натужлівай працай у навакольных лясах і на сплаве на рацэ Нарве. Калісьці не лічыўся мужчынам той, хто не прахадзіў усю сваю маладосць за арэлькай.

(мох)

Вынікі конкурсу

Гайнаўскі КРУС ад пару гадоў паслядоўна арганізоўвае прэвентыўны конкурс пад загалоўкам „Здароўе і бяспечнасць працы ў сельскай гаспадарцы”. У гэтым годзе ў Нараўчанскай гміне найлепшыя месцы ў спаборніцтве занялі: Барбара і Яраслаў Бірыцкія з Семяноўкі (першае месца) ды Міраслава і Раман Радзіванюкі таксама з Семяноўкі (другое мнсца), а таксама Рыгор Раманчук з Альхоўкі (трэцяе месца) ды Малгажата і Станіслаў Садоўскія з Тарнаполя (чацвёртае месца). Віншуем!

(ян)

Усё забралі. Асталася адна беларуская кніжачка...

Адной з галоўных задач Беларускага таварыства культуры ў Літве — ушаноўванне памяці славутых беларусаў. Сёлета, у Дзень настаўніка, на будынку былой Беларускай гімназіі, якая 25 год працавала ў віленскіх базыльянскіх мурах, былі адкрыты мемарыяльныя табліцы ў гонар Наталлі Арсенневай і яе настаўніка Максіма Гарэцкага.

Падзея сімвалічная не толькі з прычыны Свята настаўніка. Прозвішча Наталлі Арсенневай зноў выкінутае са школьнай праграмы ў Беларусі. Афіцыйныя СМІ замоўчваюць трагічны для Беларусі 1937 год. Менавіта, у кастрычніку 1937 года быў арыштаваны і Максім Гарэцкі, бацька беларускай прозы, літаратурны крытык, аўтар першых падручнікаў па літаратуры, складальнік слоўнікаў, настаўнік, грамадскі дзеяч...

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Радзім Гарэцкі ля дошкі Максіму Гарэцкаму

Пра гістарычную і сямейную памяць гутарым з пляменнікам Максіма Гарэцкага, прафесарам Радзімам Гарэцкім, народжаным у 1928 годзе.

— ***Як у Беларусі ўшаноўваецца памяць Максіма Гарэцкага?***

— Ну, ведаеце... Максімумам такога ўшанавання было, канешне, стагоддзе з дня нараджэння. У 1993 годзе. Тады ўшаноўвалі разам і дзяржава, і грамадскасць. І таму гэта атрымалася вельмі выдатна. Былі імпрэзы, вечарыны, была спецыяльная паездка ў Горкі, была адкрыта сядзіба ў Малой Багацькаўцы, якраз там, дзе ён нарадзіўся. Былі адкрыты дошкі на Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Праз год адкрылі помнік на Плошчы Волі. На адкрыцці былі ўсе народныя пісьменнікі: Быкаў, Навуменка, Шамякін, Брыль, Гілевіч. Былі дзяржаўныя ўлады і грамадскасць.

Пасля 1994 года, калі ў нас настала прэзідэнцкая краіна, усё пайшло наадварот. Ад таго часу, афіцыйнай і шырокай урачыстасці ў гонар Максіма Гарэцкага не было. Хаця было 105-годдзе і 110-годдзе, а ў наступным годзе маем 115-годдзе. Зараз, калі адзначаць — то адзначаецца больш сціпла. Ёсць у нас рэспубліканскі Фонд братоў Гарэцкіх. Фонд разам з Музеем гісторыі літаратуры і Інстытутам літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук і Геалагічным інстытутам НАН кожны год праводзяць *Гарэцкія чытанні*, дзе слухаюць лекцыі і даклады, найперш пра Максіма Гарэцкага і яго брата Гаўрылу Гарэцкага.

— ***У Мінску ці па ўсёй Беларусі?***

— Яны пачаліся ў 1993 годзе, некалькі разоў іх арганізавалі ў Горках, былі ў Магілёве, у Пінску... А зараз толькі ў Мінску. Няма на паездкі грошай.

Заўсёды пасля гэтых чытанняў у нас выдаецца зборнік. У гэтым годзе адбыліся ўжо 15-ыя чытанні і ў канцы года або ў пачатку новага выйдзе пятнаццаты том. Ну гэтае, калі параўноўваць тое са стагоддзем, дык гэтага не параўнаць.

— ***Якое месца займае Максім Гарэцкі ў праграме навучання па беларускай літаратуры?***

— Ёсць некалькі апавяданняў і нешта пра яго самога.

— ***Скажыце, у якіх гарадах яго імем названы вуліцы?***

— У Мінску вуліца Гарэцкага з'явілася пасля адсвяткаванага стагоддзя. Да гэтага былі ўжо вуліцы ў Мсціславе і ў Горках. Потым у Маладзечне.

— ***То і не так шмат?***

— Не, не так шмат.

— ***Увесь час адносімся да дня нараджэння. У гэтым годзе адзначаем 70 гадоў з трагічнага 1937 года. Ці гаворыцца пра ссылку і расстрэл Максіма Гарэцкага?***

— Ведаеце, гаворыцца мала, або і зусім... У дзяржаўных газетах і тэлебачанні зусім не гаворыцца.

— ***А якім чынам Вы першы раз пачулі пра Максіма Гарэцкага?***

— Я, канешне, чуў пра Максіма Гарэцкага, аднак у час сталінізму нельга было пра гэта гаварыць. Нават у сям'і. Я нарадзіўся ў Мінску, але малым быў вывезены ў Расію. Мой бацька таксама быў арыштаваны і быў вывезены на поўнач. Маё дзяцінства прайшло ў наваколлі Беламорскага канала. У Мінск я вярнуўся ў снежні 1971 года, пасля 30 гадоў пражывання ў Расіі. Мову я ніколі не вывучаў, быў сапраўдным расіянінам. Канешне, я нічога тады не чытаў з твораў Максіма Гарэцкага. У нас у сям'і нічога не захавалася, таму што ўсё былі ператрусы і ператрусы. Усё забралі. Асталася толькі адна беларуская кніжачка „Рунь” , і больш нічога. Я пазнаваў творчасць дзядзькі ўжо ў 1960-ыя гады.

— ***У якім годзе рэабілітавалі Максіма Гарэцкага?***

— У 1958 годзе.

— ***Вашага бацьку вывезлі раней?***

— Ужо ў 1930 годзе яго саслалі ў Карэлію, у Мядзведжагорск. Мы спачатку жылі з маці і братам у Мінску, а праз два гады паехалі туды, да бацькі. Бацька працаваў геолагам у Гідрапраекце. Вось, усе вялікія *стройкі камунізма*, розны плаціны — як Куйбышаўская ГЭС, Цымлянская ГЭС, Горкаўская АГЭС, — гэта ўсё будаваў бацька. Мы ездзілі па ўсёй Расіі. Пакуль я скончыў 10 класаў, дык вучыўся ў 13 школах. Я таксама геолаг, скончыў Маскоўскі нафтаінстытут, 20 гадоў працаваў у Акадэміі навук у Маскве, а на бацькаўшчыну ўжо вярнуўся сапраўдным геолагам, у 1971 годзе.

— ***Ці ў Вашай сям'і гаварылі пра смерць дзядзькі?***

— З самага пачатку, калі Максім Гарэцкі некуды згінуў, ягоная жонка Леаніла Гарэцкая-Чарняўская і дачка ўвесь час пісалі. У канцы яны атрымалі паведамленне, што быццам Максім Гарэцкі загінуў ад крывазліцця ў мозг. Паводле атрыманага ад органаў паведамлення Гарэцкі скончыўся ў 1939 годзе, у Комі АССР. Гэтая дата ўвайшла ў энцыклапедыі, падручнікі, усе так і лічылі... І яго жонка, і мой бацька... І толькі ў 1991 годзе, калі пачалася *адліга*, я напісаў у нашае КДБ і яны мне паказалі справу. Я даведаўся нарэшце праўду. Максім Гарэцкі на самай справе не быў у Комі АССР. Яго забралі ў кастрычніку 1937 года і расстралялі ўжо 10 лютага 1938 года ў Вязьме Смаленскай вобласці.

На жаль, яго жонка Леаніла Гарэцкая-Чарняўская і мой бацька так і памерлі, не даведаўшыся праўды.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Галіна і Радзім Гарэцкія ў гасцях у Хведара Нюнькі

„Каляндар...” Уладзіміра Хільмановіча — гэта універсальны агульнабеларускі энцыклапедычны даведнік, выхаду якога я вельмі чакаў. Такімі календарамі павінны штогод проста завальваць аўтары і выдавецтвы нашы бібліятэкі, школы, вучылішчы, вышэйшыя навучальныя ўстановы і арганізацыі...

Энцыклапедычны каляндар-даведнік Уладзіміра Хільмановіча

Сяргей ЧЫГРЫН

Пра беларускія календары даўно нам трэба было напісаць і выдаць добрую кнігу. І гэта ёсць каму зрабіць. Найперш такое выданне мог бы ажыццявіць Янка Саламевіч, які пра беларускія календары ведае амаль усё. Ды і ў яго асабістай хатняй бібліятэцы маюцца дзесяткі календароў, сярод якіх — календары-кніжкі „Нашай нівы” на 1910, 1911, 1913 гады. Ёсць насценны каляндар „Нашай нівы” на 1913 год, каляндар „Заранка” (Мінск 1919), „Biełaruski kalendar Swajak na 1919 hod”, „Biełaruski kalendar Krynica na 1920 hod”. Мае бібліяфіл і заходнебеларускія календары на 1924, 1929, 1932 гады, каляндар Сяргея Сахарава (Рыга) на 1937 год. Ёсць усе беластоцкія беларускія календары ад 1957 года, беларускі праваслаўны каляндар на 1968 год, мінскія календары на 1974, 1976 гады, каляндар „Янка Купала і Якуб Колас”, выдадзены да іх 100-годдзя з дня нараджэння ў 1982 годзе, шыкоўны каляндар „Шляхам Францыска Скарыны” (1990), усе адрыўныя календары „Родны край” з 1990 года, беларускія календары на 1991-1993 гады (выданні Беларускай энцыклапедыі, пасля 1993 года яны спыніліся) і многія іншыя. Ды і сам спадар Саламевіч прымаў актыўны ўдзел у складанні літаратурна-мастацкага календара „Кола дзён” (1987, 1988; у сааўтарстве) і „Календара памятных дат 2001” (2001). Цяпер гэтыя календары ўжо не выходзяць. Ды і ў апошнія гады беларускімі календарамі нас не вельмі радуюць гісторыкі, энцыклапедысты, краязнаўцы і дзяржаўныя ды прыватныя выдавецтвы. Ці то не хочуць займацца гэтай клапатлівай і нялёгкай працай, ці то не ўмеюць. Прасцей выдаць каляндар-плакат з якоюнебудзь прыгажуняй і досыць. Павісіць ён на сцяне адзін год і яго выкінуць на сметнік.

Але які б цяжкі лёс для Беларусі не быў, на працягу апошніх 500 гадоў мы выдавалі шыкоўныя календары. А вытокі беларускага друкаванага календара магчыма ў „Пасхаліі”, заключнай частцы „Малой падарожнай кніжкі” Францішка Скарыны (Вільня 1522). Гэта першы ўсходнеславянскі друкаваны царкоўна-астранамічны каляндар на 1523-1543 гады. Беларус Ілья Капіевіч у 1702 годзе ў Амстэрдаме надрукаваў першы рускі каляндар „Святцы, або Каляндар”. З 1713 года ў Супрасльскай друкарні выдаваўся на польскай мове „Каляндар польскі і рускі”, у якім былі звесткі пра кірмашы Вялікага княства Літоўскага, пра беларускія гарады і пасёлкі, пра рэлігійных дзеячаў і іншыя матэрыялы. З 1957 года (сёлета спаўняецца 50 гадоў) Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы выдае „Беларускі каляндар”. Выдаваліся беларускія календары таксама ў Аргенціне, у Францыі, у ЗША. Спіс календароў і месца іх выдання можна працягваць доўга. Але найбольш календароў з'явілася на Бацькаўшчыне.

І знаны календаравед Янка Саламевіч пра іх можа распавядаць бясконца. А калі з'яўляецца ў друку новы календар, ён абавязкова яго набудзе, уважліва прачытае і будзе радавацца, што ён выйшаў з друку, а таксама за тых, хто над календаром клапатліва працаваў. Спадзяюся, што спадар Саламевіч і многія іншыя, хто цікавіцца нашай гісторыяй, будуць задаволены новым „Беларускім календаром-даведнікам на кожны дзень”, які выйшаў з друку зусім нядаўна ў Вільні ў выдавецтве „Gudas”. Не адзін год руплiва працаваў над ім і ўкладаў яго Уладзімір Хільмановіч — гісторык, краязнавец, педагог і журналіст з Гродна.

„Каляндар...” Уладзіміра Хільмановіча — гэта універсальны агульнабеларускі энцыклапедычны даведнік, выхаду якога я вельмі чакаў. Такімі календарамі павінны штогод проста завальваць аўтары і выдавецтвы нашы бібліятэкі, школы, вучылішчы, вышэйшыя навучальныя ўстановы і арганізацыі, каб мы добра ведалі пра нашых знакамітых людзей, пра значныя падзеі нашай Айчыны і шчыра ўшаноўвалі іх штогод. Але такіх календароў у нас няма. І тое, што зрабіў Уладзімір Хільмановіч, гэта своеасаблівае гісторыка-краязнаўчае адкрыццё.

Канцэпцыя, як піша ва ўступным слове складальнік, вельмі простая: з 1 студзеня да 31 снежня па днях распісаны самыя вялікія і значныя падзеі Беларусі, а таксама трагічныя даты нашай гісторыі, дні нараджэння і смерці знакамітых людзей, якія праславілі Беларусь у змаганні за яе незалежнасць, на ніве культуры, літаратуры, навукі, гісторыі, рэлігіі. Змястоўна сам каляндар не састарэе ніколі. Іншая справа, што ён можа дапаўняцца, удакладняцца, правярацца.

Вельмі добра, што Уладзімір Хільмановіч указвае месца нараджэння кожнай знакамітай асобы паводле сённяшняга адміністрацыйнага падзелу. А ў канцы календара ёсць храналагічны паказальнік дат, імянны паказальнік і бібліяграфія. Любое прозвішча ў календары можна лёгка знайсці па імянным паказальніку. Давайце, напрыклад, пагартаем каляндар і паглядзім дзень 1-га лістапада: чым гэты дзень знаны ў нашай гісторыі і якіх людзей мы павінны штогод згадваць у гэты дзень, паводле календара Уладзіміра Хільмановіча? У гэты дзень нарадзіліся гісторык і архівіст Дзмітрый Даўгяла, літаратуразнавец Іван Замоцін, грамадскі дзеяч на эміграцыі і гісторык Іван Касяк, пісьменнікі Янка Золак, Міхась Кавыль, Вячаслаў Адамчык. У гэты дзень у Паставах у 1943 годзе нацыстамі быў забіты Адам Дасюкевіч, у 1984 годзе памёр мастак Пётра Сергіевіч, у 1992 годзе памерла гімнастка Тамара Лазаковіч. У гэты дзень у 1986 годзе адкрыўся Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей, у 1987 годзе ў Купалаўскім парку ў Мінску былі адзначаны Дзяды і заяўлена пра савецкі генацыд, а ў 1992 годзе адбыўся Устаноўчы сейм Згуртавання беларускай шляхты.

Вядома, і пра гэта прызнаецца сам складальнік, выбар датаў і персаналій мае ў значнай ступені чыста суб'ектыўны характар. „Але галоўным крытэрыем адбору асоб служыла прыналежнасць да беларускага руху ў розных яго праяўленнях”, — сцвярджае Уладзімір Хільмановіч. Тым не менш, у „Беларускі каляндар-даведнік на кожны дзень” абавязкова павінны былі ўвайсці такія знаныя і шчырыя беларусы, як Казімір Чарноўскі, Аляксандр Рыпінскі, Ахіла Банольдзі, Фларыян Даноўскі, Каміла Марцінкевіч, Адам Пуслоўскі, Мікалай Судзілоўскі-Русель, Аляксандр Чарвякоў, Мікалай Пятрэнка, Яўгенія Пфляўмбаўм, Яўген Глебаў, Валянцін Ермаловіч, Здзіслаў Стома, Уладзімір Мулявін і іншыя. Нават мае землякі-слонімцы, якія моцна любілі Беларусь і былі ёй адданыя да канца свайго жыцця, не ўсе трапілі ў каляндар. Няма паэткі Валянціны Ададуравай, паэтаў Янкі Карповіча, Алеся Сучка, празаіка Івана Сяргейчыка, мастака Антона Карніцкага, заснавальніка Слонімскага беларускага драмтэатра Мікалая Варвашэвіча і некаторых іншых. Але гэта мая суб'ектыўная заўвага, бо, магчыма, гэтыя людзі і не такія значныя асобы ў гісторыі Беларусі. Жылі, працавалі так, як і належыць кожнаму беларусу. І магчыма ў кожным раёне нехта знойдзецца і прапануе для календара сваіх знакамітых землякоў. І гэта добра. І, відаць, як просіць сам складальнік календара, усе дапаўненні будуць улічаны ў наступных выданнях. І, дай Божа, каб падобны даведнік, як і розныя энцыклапедыі, дапаўняўся і яшчэ меў некалькі выданняў. Але тое, што зрабіў Уладзімір Хільмановіч цяпер, гэта яго вялікая заслуга. І выхад „Беларускага календара-даведніка на кожны дзень”, які ён склаў, гэта новая старонка ў гісторыі беларускага календаразнаўства.

У пятнаццацігадовы юбілей

Аб'яднанне Польшча — Беларусь

Узнікненне новых дзяржаў на ўсходняй мяжы Польшчы было прызнана ўспрынята насельніцтвам нашай краіны. Польшча пастановай Рады Міністраў 27 снежня 1991 года прызнала незалежнасць Беларусі. Афіцыйнае ўстанаўленне дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю наступіла 2 сакавіка 1992 года, што было пазітыўна сустрэта насельніцтвам абедзвюх дзяржаў, асабліва нацыянальнымі меншасцямі. 23 чэрвеня 1992 года быў падпісаны дагавор аб добрасуседстве і дзяржаўным супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь, а таксама аб паглыбленні ўзаемнага паразумення паміж польскім і беларускім народамі.

Сучасная грамадзянская супольнасць не можа сфармавацца без сектара няўрадавых арганізацый. Таму ініцыятыва стварэння такой арганізацыі дыктавалася неабходнасцю пашырэння ведаў польскага грамадства аб гісторыі, культуры, навуцы і эканоміцы сваёй усходняй суседкі, пазнаннем жыцця нацыянальных меншасцей у абедзвюх краінах, зацікаўленнем палякаў развіццём памежных сяброўскіх кантактаў і шырокага партнёрскага супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю. Таму ініцыятыўная група дзеячаў-заснавальнікаў, пасля ўтворанага ў Мінску ў 1991 годзе Таварыства Беларусь — Польшча, апрацавала статут і падала ў судовы рэестр у Варшаве новую арганізацыю пад назвай Аб'яднанне Польшча — Беларусь.

21 чэрвеня 1992 года ў Доме дружбы ў Варшаве адбыўся Устаноўчы кангрэс Аб'яднання Польшча — Беларусь. Удзельнікі кангрэса зацвердзілі статут, прынялі праграму і выбралі ўлады Аб'яднання: Галоўнае праўленне, яго Прэзідыум і Галоўную рэвізійную камісію на пяцігадовы тэрмін паўнамоцтваў.

II Кангрэс Аб'яднання Польшча — Беларусь адбыўся 6 чэрвеня 1997 года ў Варшаве, а чарговы III Кангрэс — 19 верасня 2002 года.

11 кастрычніка 2007 года ў Доме дружбы ў Варшаве адбыўся юбілейны IV Кангрэс Аб'яднання Польшча — Беларусь. Пасля цікавай дыскусіі аб далейшай працы дэлегаты прынялі галоўныя напрамкі дзейнасці Аб'яднання на 2007-2012 гады і выбралі новыя ўлады. Старшынёю Аб'яднання надалей астаўся нястомны прафесар Баляслаў Хмялінскі, аўтар цікавай і змястоўнай манаграфіі „Stowarzyszenie Polska — Białoruś w kształtowaniu polsko-białoruskich stosunków 1992-2006” (Warszawa 2006). Варта прыгадаць, што гэтая кніжка паявілася ў Мінску ў перакладзе на беларускую мову.

Адным з галоўных напрамкаў дзейнасці Аб'яднання ёсць арганізацыя супрацоўніцтва ў галіне навукі, асветы, культуры, у асяроддзі моладзі. (Варта тут прыгадаць, што Аб'яднанне ў далейшым будзе займацца Алімпіядай беларускай мовы, удзельнічаць у арганізацыі конкурсу „Паэзія і проза на ўсход ад Буга” і інш.).

Аб'яднанне Польшча — Беларусь налічвае каля 2 тысяч індывідуальных сяброў і сімпатыкаў. Актыў Аб'яднання канцэнтруецца ў ваяводствах пры сядзібах аддзяленняў: Люблінскім, з сядзібай у Белай-Падляшскай, Любушскім, з сядзібай у Зялёнай Гуры, Лодзінскім, Мазавецкім, з сядзібай у Варшаве, Падляшскім з сядзібай у Беластоку, Паморскім, з сядзібай у Гданьску.

Віктар ШВЕД

З нагоды пяцідзесятай гадавіны Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа"

Кніга на юбілей

Раіна СТЭФАНЧУК

„У культуры памежных ліній не бывае. Яна «сшывае» межы" — піша ва ўступе да толькі што выйшаўшай з друкарні кнігі-зборніка крытычна-літаратурных аналізаў *Шлях па прамой часу* Алесь Пашкевіч, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў. Кніга выдадзена з нагоды пяцідзесятай гадавіны (2008 г.) Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Дае яна вобраз творчай дзейнасці празаікаў і паэтаў звязаных з „Белавежай". Апынуліся тут аналізы літаратурнай дзейнасці м.інш. Яна Чыквіна, Уладзіміра Гайдука, Міхася Шаховіча, Галіны Твараповіч, Юрыя Баены, Сакрата Яновіча, Міхася Андрасюка, Віктара Шведа, Алеся Барскага, Міры Лукшы. Што цікава, апісваюць іх творчасць спецыялісты ад літаратуры з Польшчы і Беларусі, але і з Вялікабрытаніі, як гэта ёсць у выпадку фаната беларускамоўнай прозы і паэзіі Арнольда МакМіліна, частага госця Беларускіх трыялогаў Вілы Сакратас, заснаванай Сакратам Яновічам. Дарэчы, два тэксты паказаліся па-польску (Васіля Белаказовіча з Ольштына: „Dom rodzinny, ziemia i mowa ojczysta" аб паэзіі Віктара Шведа) і якраз па-англійску.

Алесь Пашкевіч ва ўступе прыгадвае, што „Белавежа" выдала на працягу юбілейных пяцідзесяці гадоў 150 кніжак прыгожага пісьменства і выдае штогод чосопіс „Тэрмапілы". Перачытваючы толькі адны загалоўкі аналітычных прац змешчаных у „Шляху..." даецца прыкмеціць, што „белавежцы" стварылі арыгінальныя з'явы, непаўторныя на літаратурным абшары гэтай часткі Еўропы, польска-беларускага, а цяпер таксама беларуска-еўрасаюзнага пагранічча. Напрыклад, Ала Брадзіхіна азагаловіла свой агляд „Новы сантыменталізм Алеся Барскага", Уладзімір Конан „Біблейскія архетыпы і хрысціянскія матывы ў паэзіі Яна Чыквіна", Юрый Паталкоў. „Цуд вечнага жыцця" ці хоць бы Алесь Макарэвіч „Сэнсавая прастора зборніка апавяданняў Міры Лукшы «Бабскія гісторыі». Кніга падагульваючая творчасць членаў „Белавежы" складаецца з трох частак. Увядзеннем у іх з'яўляецца тэкст Галіны Тычкі з Мінска: „Літаратура Беласточчыны ў агульнанацыянальным і беларускім кантэксце". Распачынае яго знамянальны сказ: „Асэнсаванне шляхоў фармавання і развіцця беларускай літаратуры Беласточчыны ў другой палове XX стагоддзя немінуча вядзе да роздуму над тагачасным гісторыка-палітычным кантэкстам нацыянальнага быцця не толькі беларускага, але і ўсіх славянскіх народаў". Пры канцы працы адзначае: „На жаль, выглядае так, што не толькі беластоцкія беларусы, але і ўсе беларусы ўвогуле напрыканцы XX стагоддзя геапалітычна апынуліся ў найбольш небяспечным становішчы нацыянальных меншасцяў, што пагражае нам поўнай стратай нацыянальнай саматоеснасці. У такіх умовах беларуская мова і беларускамоўная творчасць набываюць сакральнае значэнне. Яны робяцца сродкам самавыяўлення не толькі і не столькі самога творцы, колькі праявай глыбіннай, ментальнай сутнасці самасвядомасці яго нацыі".

Шлях па прамой часу (1958-2008). Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа", рэдактар: Ян Чыквін, Беласток 2007, сс.322.

Чытаючы „Шлях..." цяжка не мець уражання, аб чым у пасляслоўі піша Ян Чыквін, што „Пяцідзесяцігадовая дзейнасць Беларускага аб'яднання «Белавежа» дае падставы для шматлікіх высноў, разважанняў, рэфлексій". Несумненна, яго шматгадовае функцыянаванне, а перш за ўсё тое, што з'яўляецца яго эфектам, з'яўляецца адной з найбольшых з'яў пасляваеннай літаратуры ўзнікаючай у Польшчы, дапаўняючай вобраз літаратурнай культуры народаў г.зв. Сярэдне-Усходняй Еўропы, славянскай, раўнацэннай заходнім культурам.

http://www.hockeyby.org

На старонках „Нівы" мы ўжо пісалі аб існуючых у Інтэрнэце беларускамоўных спартыўных сайтах. І калі апошняй нашай спартыўна-віртуальнай тэмай быў футбол, то сёння звернем увагу на той від спорту, якому цяперашняе беларускае кіраўніцтва з усім імпэтам імкнецца прыдаць рысы нацыянальнага. Шчыра кажучы, не надта добра гэта атрымліваецца, але, як сведчыць кітайская мудрасць — жамчужына, нават у руках дурня не перастае быць жамчужынай. Тое ж самае і з хакеем — будуць ці не будуць беларускія хакеісты сярод прызёраў разнастайных спаборніцтваў — для тых, хто некалькі разоў узімку выйдзе пабегаць на каньках з клюшкай асаблівага значэння не мае. Хаця, канешне, прыемна адчуваць гонар за тых, хто, прадстаўляючы тваю нацыю, напрыклад, на Алімпійскіх гульнях выйдзе ў шэрагі лепшых. Ну а для тых, каму вельмі залежыць як выступіць тая ці іншая хакейная беларуская каманда цяпер існуе сайт у Інтэрнэце, дзе можна не толькі адсачыць расклад і вынікі розных гульняў, але і атрымаць нейкую дадатковую інфармацыю.

Каб выйсці на сайт „Хакей.бай" трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас http://www.hockeyby.org. Нельга сказаць, што перад намі адкрыецца нейкае аздобленае разнастайнымі ўпрыгожаннямі ці мноствам рубрык выяўленне. Хутчэй наадварот, сайт здзіўляе сваёй сціпласцю і недапрацаванасцю. Магчыма, гэта з-за таго, што робіць яго толькі адна асоба, якая, па беларускай інтэрнэт-завядзёнцы, не пажадала раскрыць уласнае імя. Каб даведацца, з якой нагоды з'явіўся даны сайт і да якіх мэт імкнуўся яго аўтар і ідэйны натхняльнік, трэба быць кемлівым і ўпартым, бо адказы на такое пытанне знаходзяцца „глыбока" ў „Навінах", якія, на жаль, не заархізаваныя.

„Шмат старонак Сеціва прысьвечана гэтай цікавай гульні, — распавядае аўтар-інкогніта аб хакеі і сваім сайце. — Таму можа ўзьнікнуць пытаньне — а навошта яшчэ адна? Я паспрабую сабраць у адным месцы ўсе навіны ды іншую інфармацыю аб хакеі ў Паўночнай Амэрыцы й Расеі, Швэйцарыі й Нямеччыне, у Чэхіі й Швэцыі, Славаччыне й Фінляндыі. Вядома ж, першаснасьць будзе мець беларускі хакей як на клюбным узроўні, так і на ўзроўні зборнай. Як я зьбіраюся пацягнуць такі аб'ём працы? Па-першае, мне гэта сапраўды цікава, а па-другое, вельмі спадзяюся на тое, што ў розных месцах сьвету змагу знайсьці аднадумцаў сярод сапраўдных заўзятараў хакею і разам мы зробім гэты праект моцным і цікавым!"

Варта адзначыць, што навіны на сайце абнаўляюцца даволі рэгулярна. Прыемна і тое, што з правага боку месцяцца табліцы гульняў і вынікі сустрэч у розных хакейных лігах — як беларускіх, так і міжнародных. Праўда, зусім непрыемна тое, што, прынамсі, у рубрыцы „Аналітыка" аніводная спасылка на працяг артыкула ні да чаго не вядзе. Таму і даведацца, што распавядалі аўтары, не ўяўляецца магчымым. Будзем спадзявацца, што бліжэйшым часам гэты недахоп на сайце будзе выпраўлены.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Як галавой аб штангу

Той, хто не глядзеў футбольны матч Беларусь — Люксембург і даведаўся пра вынік (нашы прапусцілі адзіны мяч на 95-й хвіліне), напэўна меў адчуванне, што моцна здаўся галавой аб штангу брамы. Да такога стану за пару месяцаў давёў нацыянальную зборную Беларусі нямецкі „спецыяліст" Бернд Штанге. І справа тут нават не ў тым, што маленькі Люксембург да прыезду ў Гомель не выйграваў ні ў каго дванаццаць гадоў. Рэч у тым, што назіраецца няўхільнае ігнараванне новым трэнерскім штабам ранейшых напрацовак і меркаванняў тых, хто сапраўды разбіраецца ў беларускім футболе. У выніку зборная прайграла запар тры афіцыйныя матчы, а ўслед і таварыскую сустрэчу на полі Ізраілю, які выступаў фактычна другім складам.

Канешне, зусім няправільна было б „вешаць усіх сабак" на галоўнага трэнера, эксперыменты якога выклікаюць ужо не шчырае здзіўленне, а гамерычны смех і нагадваюць звычайнае шарлатанства. Пытанні мусяць быць да тых, хто гэтага трэнера ўзяў на высокааплачваемую працу. Дзесяць год таму — у 1997 годзе беларуская дружына пад кіраваннем Міхаіла Вергяенкі пацярпела сем паразаў запар. Добра памятаю, як пасля чарговага фіяска на прэс-канферэнцыі ў Мінску не прагучала аніводнага пытання (!) — усё было і так занадта відавочна. Увесь пазнейшы час — аж да сённяшняга дня той самы Вергяенка займае адну з вышэйшых пасад у беларускай федэрацыі футбола. І менавіта федэрацыя перад усім вінаватая ў дзівацтвах замежнага гастралёра, які некалькі месяцаў таму быў абсалютна не запатрабаваны ў футбольным свеце, але функцыянерам у Беларусі падаўся „выратавальнікам". Зрэшты, ужо не трэба і часу, каб зразумець, чаму галоўная каманда краіны апынулася ў такім нягеглым стане. Гэта толькі Штанге сцвярджае, што яго каманда гуляе ўсё лепш і лепш...

А вось шарадай для мяне, як і для многіх іншых, застаецца тая з'ява, што айчынныя футбалісты, выявіўшы сябе перспектыўнымі на моладзевым роўні, пасля, усе як адзін, загадкава „згасаюць". Тычыцца гэта і многіх з тых, хто зараз уваходзіць у абойму нацыянальнай дружыны. Тым часам на мінулым тыдні моладзевая зборная краіны падарыла чарговую порцыю аптымізму — каманда Юрыя Курненіна, у адрозненне ад дарослай, не пляцецца ў хвасце, а ўзначальвае турнірную табліцу ў сваёй групе. Выязная вікторыя над венграмі 1:0 дазволіла беларусам крыху адарвацца ад канкурэнтаў. Становішча пасля пяці гульняў наступнае: Беларусь — 12 ачкоў, Сербія — 10, Венгрыя — 9, Латвія — 4, Сан-Марына — 0. У лістападзе нашым давядзецца згуляць яшчэ два матчы на сваім полі — 16-га з сан-марынцамі, якія няздольныя на сенсацыю, а 20-га ключавы паядынак з сербамі. Імёны Антона Пуцілы, Аляксея Кучука, Леаніда Ковеля, Міхаіла Афанасьева, іншых нашых хлопцаў, зараз на слыху ў экспертаў. Толькі ці вырастуць яны пры сваім бясспрэчным таленце ў сапраўдных майстроў?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Весткі з Чаромхі

Павеяла аптымізмам

27 верасня ў Чаромсе адбылася сустрэча лакальнай грамадскасці з віцэ-міністрам Яраславам Зялінскім. Мэтай спаткання было захаванне існуючай дагэтуль колькасці пар цягнікоў на лініі Чаромха — Беласток пасля ўвядзення ў снежні новага раскладу язды. У час дыскусіі, як і ў канцы сустрэчы віцэ-міністр Яраслаў Зялінскі абяцаў дапамогу, чаго рэзультатам было запрашэнне прадстаўнікоў мясцовага і павятовага самаўрадаў у міністэрства.

Сустрэча адбылася 2 кастрычніка. Чаромху прадстаўлялі войт Міхал Врублеўскі і старшыня прафсаюзнай арганізацыі паравознага дэпо Здзіслаў Чаркоўскі. Удзельнічала таксама дырэктар Ваяводскай установы працы ў Беластоку. Надзея Суліма, старшыня Рады гміны ў Чаромсе (заадно старшыня таварыства „Прыязны транспарт") вынікі сустрэчы пракаментавала наступным чынам:

— Усё на добрай дарозе. Ваяводская ўстанова працы прызначыла грошы з фонду для беспрацоўных на падтрымку рамонту лініі Чаромха — Беласток. Інвестыцыя будзе рэалізавацца сёлета і ў наступным годзе гміннымі самаўрадамі. Наконт гэтай справы адбылося пасяджэнне ў Ваяводскай установе працы (удзельнічалі, між іншым, прадстаўнікі Чаромхі, Кляшчэляў і Орлі). Разлікавая гаспадарчая палата, у якую была накіравана адпаведная заява Ваяводскай установы, павінна падшукаць юрыдычную аснову для рэфундацыі фінансавых сродкаў гмінам за найм рабочых, якія будуць прымацца на працу пры рамонце лініі. Яшчэ сёлета, калі паспрыяе надвор'е, будзе абменена тры тысячы шпалаў. У наступным годзе прадбачваецца абмен чарговых васьмі тысяч. Віцэ-дырэктар Польскіх чыгуначных ліній у Беластоку спадар Міхалькевіч выдаў рашэнне аб адмене хуткасці цягнікоў на лініі Зімнохі — Лявіцкае з 30 на 50 км/гадз. У сваю чаргу Маршалкоўская ўправа абяцае, што ў выпадку павышэння хуткасці захаваецца па-даўнейшаму шэсць пар паяздоў з Чаромхі ў Беласток. Гэта прыемная вестка. Хацелася б, каб такія ластаўкі прыляталі не толькі ў перадвыбарчай кампаніі, але і ў наступным годзе напрадвесні, калі прыйдзецца вырашаць праблему перагрузачнага раёна чыгуначнай Семяноўкі, што абяцаў перад выбарамі кандыдат ад ПСЛ Мікалай Яноўскі.

Калі гэта скончыцца?

Нядзеля, 7 кастрычніка. Праводзім з жонкаю дачку з дзеткамі і зяцем на цягнік, які адпраўляецца з Чаромхі ў Беласток у 16^{57}. На пятнаццаць мінут да ад'езду цягніка рэйкавы аўтобус з двума маленькімі вагончыкамі набіты пасажырамі. А людзі ўвесь час падыходзяць. Многія ўжо на пачатковай станцыі ў Чаромсе вымушаны былі стаяць. А што было на наступных прыпынках? Гэты цягнік з'яўляецца адным з больш рэнтабельных на згаданай лініі, асабліва ў нядзелі і святочныя дні, паколькі ў гэты час большасць падарожных вяртаецца ў Беласток пасля уік-энду, а моладзь едзе на заняткі ў школу. І тут маё пытанне да перавозчыка — Прадпрыемства рэгіянальнай пасажырскай перавозкі ў Беластоку: калі скончыцца кашмар для падарожных на лініі Чаромха — Беласток? Чалавек, які аплачвае праезд, павінен карыстацца адпаведнымі ўмовамі падарожжа. Не гавару ўжо аб камфорце язды, але пасажыр павінен мець, прынамсі, месца для сядзення і... доступ да туалета. Рэйкавыя аўтобусы (старога тыпу) не маюць гэтых апошніх і такімі можна пакарыстацца адно на прыгарадскіх лініях, дзе праезд доўжыцца не больш чым гадзіну (напрыклад у Гайнаўку — 37 хвілін). А ў Беласток трэба ехаць дзве гадзіны. Не раз было, што кіраўнік вымушаны быў спыняць цягнік у полі, каб пасажыр змог аформіць свае фізіялагічныя патрэбы ў адкосе. Мне здаецца, што ў дваццаць першым стагоддзі не павінна быць такіх з'яў.

Калісьці рэйкавы аўтобус называўся „тарпеда"

Уладзімір СІДАРУК

Кароткае падарожжа з Трасцянкі ў Нарву

Трасцянка — вялікая і прыгожая вёска паміж Заблудавам і Нарвай. Цераз вёску пралягае дарога з Беластока праз Гайнаўку ў Белавежу. Дарога людная, сюдою ездзіць многа замежных турыстаў. А прыпынак ПКС у вёсцы стаіць разбіты ўжо некалькі гадоў. Восенню 2006 года на перадвыбарчым сходзе войт Нарваўскай гміны Якуб Садоўскі абяцаў сваім выбаршчыкам адрамантаваць прыпынак вясной гэтага года. Неўзабаве будзе наступная вясна, а прыпынак надалей страшыць дзірамі. А найгоршае гэта тое, што наш войт ездзіць праз Трасцянку два разы ўдзень, бо жыве ў Беластоку. У самой Нарве прыпынак адмаляваны, але трэба пад ім стаяць. Лавачкі такія нізкія, што старэйшаму чалавеку сесці ніяк не можна. А ездзяць пераважна старэйшыя людзі, а то ў асяродак здароўя, а то ў аптэку за лякарствамі. Я прапаную высокім нарваўскім чыноўнікам сесці і ўстаць з такой лавачкі як на прыпынку ПКС! Столькі думак і ўражанняў аб аўтобусных прыпынках.

фота Міры Лукшы

Трасцяніцкі прыпынак надалей страшыць дзірамі

Наймацнейшае аднак уражанне я перажыла ў нарваўскім „парку" — так называюць скверык на даўнім рынку. Там я, зрабіўшы пакупкі, прысела са знаёмымі пагутарыць крыху, пакуль прыедзе аўтобус. Аж ідзе яшчэ адзін знаёмы, крыху падвыпіўшы. І адразу звяртаецца да мяне па прозвішчу з прэтэнзіяй чаму я гавару па-беларуску, а не па-польску. Адным словам, яму гэта не падабаецца, што мы размаўляем тут пасвойму. А я яму на гэта: „Я пражыла тут на сваёй зямлі ўжо 70 год і яшчэ ніколі не чула такой заўвагі. Як хачу, так гавару са сваімі знаёмымі, і што ў ніякай канстытуцыі не запісана як можна, а як нельга гаварыць! Зрэшты, калі чалавеча не ведаеш, то твой бацька і мой бацька (вечны ім пакой) — адзін католік, а другі праваслаўны — былі добрымі сябрамі і гаварылі як хацелі, і адзін аднаго знакаміта разумелі". Чалавек замяўся. Зрабілася яму ніяк і давай прасіць прабачэння. Вось і столькі ўражанняў ад 10-кіламетровага падарожжа з Трасцянкі ў Нарву ў прыгожы вераснёўскі дзень!

Рута

Не забывайма сваіх каранёў

Калісьці я задумоўваўся над сваім радаслоўем: адкуль выходзяць мае карані? Мае бацькі лічылі сябе беларусамі. Так пакойныя татуль з матуляй гаварылі. Бацькоўскія словы быццам святыню па сённяшні дзень нашу ў сэрцы. Я не скрываю сваёй тоеснасці. Хоць у школе я не вучыўся роднай мове, але такой зараз карыстаюся. Гэта заслуга „Нівы". І ад шчырага сэрца дзякуй ёй за гэта! З „Нівай" больш паўвека злучаны мой лёс. Плён гэтага супрацоўніцтва багаты — больш за дзве тысячы допісаў. Большасць з іх захоўваецца ў дамашнім архіве. Зараз гартаю пажаўцелыя лісткі выразак і ўспамінаю мінулыя будні. „Ніва" была тады папулярным часопісам

у беларускіх вёсках. Чыталі яе вучні ў школах, чыноўнікі на дзяржаўных пасадах, земляробы.

У чацвёртым квартале 1966 года, напрыклад, на пошце ў Рыгораўцах было 156 падпісчыкаў. Найбольш чыталі ў Пашкоўшчыне і Тапчыкалах. Не горш было і ў сямідзесятых гадах (хоць не ўсюды). І так: пошта ў Орлі — 151 падпісчык, у Пасынках — 133, у Храбалах — 80, у Рыгораўцах — 39, у Аўгустове — 5, у Снежках — 3 ды ў Пілікаx — 0. У маёй роднай Чаромсе-Станцыі на пошце на „Ніву" падпісалася 14 чалавек. У кіёску на пероне прадавалася каля 50 экземпляраў. Зараз „Ніву" можна купіць адно ў кіёску.

Прычын такога стану не станем далёка шукаць. Мой сябра, аднавясковец, напрыклад, прызнаўся, што хоць вучыўся ў белліцэі, але прачытаць беларускі тэкст прыходзіцца яму цяжка. Сумна робіцца на сэрцы, калі чуем такія словы. Сумнейшым здаецца быць і тое, што наша беларуская інтэлігенцыя неадпаведна ставіцца да гэтых спраў.

У 40 нумары „Нівы" ад 7 кастрычніка г.г. прэзентаваліся вынікі апытання падляшскіх кандыдатаў у парламент, якія ідэнтыфікуюцца з беларускай і праваслаўнай меншасцю. Аўтар дайшоў да высновы, што ўсе іх адказы зводзяцца да дыпламатычна-палітычных фармулёвак, сэнс якіх наступны: не чытаюць, абяцаюць, чакаюць. Пагаджаюся з аўтарам, бо гэта святая праўда. Такую ж ацэнку можна даць большасці кіраўнікоў мясцовага самаўраду, як і чыноўнікаў на высокіх пасадах. Яны праяўляюць надта малое зацікаўленне нашымі, беларускімі справамі. Калі звяртаемся за падтрымкай да лакальнай грамадскасці і спасылаемся на сваю тоеснасць, дык варта памятаць адкуль выходзяць нашы карані.

(ус)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 650 egz.

Суседскія былі

ЗУБ МУДРАСЦІ

— І колькі ж табе гадоў? — з захапленнем усклікнуў дантыст Сямён Вінаградаў, калі ўбачыў роўныя, як новенькая школьная лінейка, і белыя, як у негра племя зулусаў зубы Пятра Куплевіча.

Вінаградаў лічыўся лепшым зубным хірургам горада, а па сумяшчальніцтве яшчэ цяжка працаваў суседам Куплевіча, з якім сябраваў з маладых гадоў, падмятаў за таго пад'езд, выносіў накіданыя на лесвіцы акуркі і ўціхамірваў сямейныя скандалы, якія з зайздроснай стабільнай перыядычнасцю ладзіла Пятру жонка. А вось у якасці пацыента бачыў таго ўпершыню.

— Першы раз бачу кліента твайго перадсмяротнага ўзросту з усімі здаровымі зубамі! І толькі зараз, на старасці гадоў, адзін з іх крыху пачаў пабольваць. І гэта пры тваім нездаровым стылю жыцця і пры тваім злачынным стаўленні да ўласнага здароўя. Гэта ж анамалія! А мо і сенсацыя! Ты ж ужо зямлёй пахнеш, а зубы яшчэ не зжаваў. Хутчэй адкрый мне сакрэт гэтай неверагоднай з'явы касмічнага маштабу, якая ўвойдзе як натацыя для будучых пакаленняў ва ўсе медыцынскія часопісы планеты. А я, нарэшце, змагу напісаць навуковую працу, атрымаць адпаведную прэмію з цэлай кучай нулёў пасля лічбы сто, з'ехаць у Ізраіль, ляжаць брухам да сонца ля Мёртвага мора і ніколі больш не глядзець на гнілыя зубы курыльшчыкаў. І самае галоўнае, змагу не дыхаць водарам іх ніколі несканчоных выдыхаў з букета натуральных пахаў, у якія ўваходзяць самагонны перагар, экстракт цыбулі і часнаку ды яшчэ перагніўшай ліверная каўбасы, засеўшай паміж зубамі адразу пасля апошняй іх чысткі месяцы два таму. Споўніцца мая мара! Я ж з дзяцінства ненавідзеў працу зубнога лекара. Марыў пра Зямлю Абетаваную і пра міжземнаморскія пляжы, дзе адзетыя толькі ў завушніцы і залатыя ланцужкі на доўгіх шыях турысткі з усяго свету робяць выгляд што загараюць. Толькі вось бацька мне сказаў, што каб здзейснілася мая мара, трэба стаць менавіта дантыстам. Ім я і стаў, а мара перайшла да маіх дзетак, якія зараз вучацца ў медыцынскіх установах Беларусі лячыць людзям зубы за сотні і сотні кіламетраў ад Іерусаліма.

— Я ўсё табе раскажу, як праваслаўны чалавек на споведзі ў вашага рабіна, — ухапіўся за надзею кваліфікавана і без болю вырваць праблемны зуб Куплевіч, і адначасова стаў напружваць мазгі, каб успомніць, калі ён апошні раз еў ліверную каўбасу. Да чысткі зубоў, ці пасля. Але зразумеўшы, што зубоў ён не чысціў ніколі ў жыцці, перастаў ламаць сабе галаву і звярнуўся да дыпламаванага суседа з прапановай: — Выдам табе сакрэт за добрую паслугу. Ты мне выдзяры апошні ніжні правы зуб так, каб я не адчуў таго. Мне зубы баляць упершыню. Але зубных лекараў я стаў баяцца яшчэ да таго, як твой разумны і хворы на семітызм бацька з дынастыі дактароў-шкоднікаў намовіў цябе такім стаць. Я іх баюся больш чым начальніка на рабоце, больш чым хваробы, больш чым смерці. Ды што там смерць! Я іх баюся больш чым сваёй жонкі.

— Гэта ўжо сур'ёзна, — уздыхнуўшы, задумаўся Вінаградаў. — Страх перад намі ў цябе сапраўды панічны. Гэта ж трэба! Баіцца нават больш, чым сваёй жонкі. Г-м-м. Выпадак клінічны. Нас многія баяцца. Але каб ажно так... Не ведаю нават чым табе дапамагчы. Вырываць зубы заўсёды балюча. А ў цябе яшчэ ў дадатак зуб мудрасці, які сядзіць у тваёй пашчэнцы няведама колькі і сам адтуль добраахвотна зыходзіць не збіраецца. Добра. Ёсць адзін сродак. Я ўвяду табе наркоз. А як ты заснеш, разбяруся з тваім зубам. Ачнешся зусім іншым чалавекам.

Пятро пагадзіўся. І салодка засынаючы пасля таго, як вялікая і тоўстая нібы ядзерная электрастанцыя медсястра Вінаградава ўвяла яму наркоз, разважаў пра тое, як тая медсястра праходзіць праз дзверы паліклінікі. Бо па Куплевічаваму перакананню, наколькі яму дазвалялі гэта зрабіць яго аптычныя здольнасці, яна ні перадам, ні бокам, а тым больш задам, не магла прайсці і праз шырока адчыненыя вароты сярэднявечнага горада...

Ачнуўся пацыент у ложку. Было вельмі цяжка, нібыта апошнія два дзесяткі гадоў без сну і добрай ежы насіў на сабе быка. Правая рука чамусьці была ў гіпсе. Цела сціскаў нейкі тугі панцыр. Над ім схілілася постаць у белым халаце і з устрывожаным выразам твару. Але гэта быў не яго сусед.

— А дзе Вінаградаў? — паміраючым голасам прастагнаў Пятро і яму моцна закалола ў левым баку. — І дзе я? І хто вы? І хто я?

— Я ваш доктар. Вы мой пацыент. Не хвалюйцеся, усё благое ўжо мінула. Вы будзеце жыць, — упэўніла яго постаць, адначасова даючы адказы на пастаўленыя пытанні. — А ваш знаёмы Вінаградаў хапіўшыся за галаву рукамі і, прастагнаўшы нешта незразумелае, накшталт „ніколі я не ўбачу цёцю Хаю", пайшоў да сябе на працу.

— Што здарылася? — напалохана выдыхнуў Куплевіч, так шырока расчыніўшы вочы, наколькі дазвалялі крывавыя зацёкі на твары.

— Наколькі я разумею, — адказаў доктар, — вам увялі наркоз. А ён вам супрацьпаказаны. І ў вас спынілася сэрца. Не вытрымала такога медыцынскага прэпарата. Вінаградаў адразу паляцеў выклікаць нас. А яго медсястра рабіла вам штучнае дыханне. Вы ж яе бачылі. У ёй кілаграмаў тысяча, не меней. Дык пакуль яна рабіла масаж сэрца, зламала вам тры левыя рабры. А пасля хацела перакласці вас з крэсла на кушэтку, але ваша рука засела ў бакавіне крэсла. Дык яна і руку зламала. Пасля кінула вас на кушэтку так, што выбіла вам аб кант пярэднія зубы. Добра, што мы прыехалі своечасова. А то яна вам і галаву разбіла б, бо вельмі хацела, каб вы выжылі, і для таго лупіла далонямі па твары з усяе сілы. Толькі не непакойцеся. Трэшчын на чэрапе няма. Мы праверылі. Усяго толькі страсенне мазгоў сярэдняй цяжкасці. А падбітыя вочы з цягам часу пройдуць.

— Божа! — завыў Пятро такім голасам, што сціхлі сірэны на ўсіх медыцынскіх машынах горада і прылягаючых да яго тэрыторый. А нейкі безнадзейна хворы, які ўжо тры месяцы ляжаў у коме, ачнуўся ды так сіганув са шпіталя, што больш яго ў гэтым раёне ніхто не бачыў. — Што вы са мной зрабілі?! Я ж зайшоў да дантыста ўсяго толькі для таго, каб... Дарэчы, а як там мой зуб мудрасці? Ніжні з правага боку.

— Зараз праверым, — прашаптаў напалоханы доктар. — Разяўце рот.

Пятро з цяжкасцю расчапіў пашчэнкі. Лекар нахіліўся. Паглядзеў. Пасля падняўся з усмешкай на твары і аптымістычным голасам запэўніў:

— Радуйцеся. На гэты раз у мяне для вас вельмі добрая навіна. Не бойцеся. З вашым любімым зубам нічога не здарылася. Ён на тым месцы, на якім і павінен быць. Цэлы і нават непашкоджаны.

Віктар САЗОНАЎ

28.10 – 03.11

Баран (22.03. — 20.04.) Добры момант, каб вырашэнні аб далейшым жыцці вырашаць не аднаму. Будзеш ведаць, што зрабіць з накопленымі ашчаднасцямі. Перастанеш над сабой жаліцца.

Бык (21.04. — 21.05.) Пры поўні Месяца шмат што зразумееш. Некаторыя будуць з табой сапернічаць або патрабаваць твайго прызнання (ігнарыруй іх, каб не адчуць сябе пасля як у танным кабарэ). Адазвуцца старыя хваробы, будзеш крыху слабейшы, стомлены.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Будзеш пільны, ніхто цябе не выведзе ў поле. Дасканалая фізічная форма. Не пераймай чужых думак, але і не адкідвай іх, хоць могуць быць не па тваёй думцы.

Рак (23.06. — 23.07.) Не разлічвай на тое, што людзі даруюць твае хібы. Не вельмі памысныя весткі ў інтарэсах. 28-31.10. клопаты; можаш усё рабіць старыя памылкі; можа дайсці да цябе вестка, якая ўскладніць твае фінансавыя планы.

Леў (24.07. — 23.08.) Можаш шмат зарабіць, ды ажыццяўляй новыя ідэі і будзь цярплівым. Работа гарыць у руках. Старайся не вяртацца ў мінулае, бо няма чаго адграбаць справы, якіх не зменіш.

Дзева (24.08. — 23.09.) У спрэчных справах выкарыстай свае мілыя рысы характару. У каханні будзь спантанны. Венера задбае аб твае прыемнасці і сардэчныя патрэбы. Схадзі да лекара заранёў (болі галавы, насавых пазух, горла, вачэй).

Шалі (24.09. — 23.10.) Прыкрасці, стрэс, праблемы з прыстасаваннем да атачэння. Шмат спакус — будзеш распусны, бяздумны. Адчуеш на сваёй скуры, што «што зашмат — дык нездарова».

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Не шкадуй грошай і часу на экскурсіі. Можаш пачуць ад каханай асобы пару горкіх слоў. Псіхічная і канкрэтная дапамога ад сяброў; памогуць ва ўсім, аб чым іх ты папросіш. 27-31.10. навыдаеш без сэнсу грошай на нават непатрэбныя рэчы ды і пераплаціш (ды грошы ж на тое, каб іх выдаваць!).

Стралец (23.11. — 22.12.) Будзеш мець уражанне, што вядзе цябе вышэйшая сіла; вер у інтуіцыю і моц малітвы. Жарснасць, прага багацця, цялесных уцех і моцных напояў могуць падвярнуць цябе плёткам. А выгоднасць і распуснасць — фінансавым стратам.

Казярог (23.12. — 20.01.) Калі думаеш пра рамантычнае падарожжа — зрабі гэта цяпер. У пары вялікая матывіроўка партнёра, які будзе цябе дапінгаваць да новых праектаў, эксперыментуй ва ўсім, за што возьмешся. Асобы, якія цябе падвядуць, страцяць твой інтарэс.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Твая незвычайная працавітасць дасць імпазантныя вынікі. Будзеш мець поспех і атрымаеш прапанову, якой пазайздросціць табе шмат асоб. Інспірацыя новымі краявідамі. Сябры моцна падмацуюць твой дух.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Усё, за што возьмешся, прынясе карысць не толькі табе, але і іншым людзям. 27-31.10. можаш быць раздражнены і агрэсіўны; гэта можа кепска адбіцца на тваім здароўі. Катайся на веласіпедзе і займіся сілавымі практыкаваннямі ў трэнажорнай зале.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. памінкі па нябожчыку, 2. снежная бура, завея, 3. Слаўгарад у Магілёўскай вобласці да 1945 года, 4. белы клён, фальклорны партнёр каліны, 5. казацкі афіцэрскі чын царскага часу, 6. прозвішча амерыканскага прэзідэнта да і пасля Клінтана, 7. рымскі бог пачатку і канца з двума супрацьлеглымі тварамі, 8. Віталь, беларускі гімнаст, шасцікратны алімпійскі чэмпіён з Барселоны, 9. ягада з пахучымі чырвонымі пладамі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 38 нумара
Вата, веер, курыца, пуп.
Рашэнне: **Павук цыруе паветра.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960